Камуністычная партыя (бальшэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 283 (5116)
СНЕЖНЯ
18
АЎТОРАК
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

УСЕАГУЛЬНАЯ СТАЧКА МЕТАЛІСТАЎ У САРАГОСЕ

ПАРЫЖ, 17 снежня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення з Іспаніі, у Сарагосе аб'яўлена усеагульная стачка металістаў у знак пратэсту супроць пазялічэння рабочага дня. Міністэрства працы, аб'явіўшы стачку незаконнай, заявіла, што усе рабочыя падвергнуцца суроваму пакаранню. У Барселоне учора пачына была адбыцца канферэнцыя усіх профсаюзаў Каталоніі. Паліцыя арыштавала 20 дэлегатаў.

У Астурыі шахцёры, не глядзячы на крайнюю нужду, адмаўляюцца аднавіць работу, пакуль не будзе адменена распараджэнне улад аб прадстаўленні рабочымі пасведчання аб «палітычнай надзейнасці» і зняцці з іх дакціласкапічных адпячаткаў (вопісі з пальцаў).

БЯЗЛІТАСНА ВЫКАРЧАВАЦЬ РАЗГРОМЛЕНЫХ ВОРАГАЎ

Сёння ўвага партыйных мас будзе прыкавана да важнейшых дакументаў двух вядучых арганізацый нашай партыі — маскоўскай і ленінградскай. Адбыліся пленумы абласных камітэтаў гэтых арганізацый сумесна з актывам, якія заслухалі і абмеркавалі даклады аб выніках лістападаўскага пленума Цэнтральнага Камітэта. У аднагалосна прынятых рэзалюцыях па дакладах сакратароў ЦК ВКП(б) — т.т. Кагановіча і Жданава — кіруючыя органы і шматлікі актыў чырвонай сталіцы і горада Леніна з агромадным натхненнем далі і поўнасцю ўхвалілі рашэнні пленума ЦК.

У абодвух рэзалюцыях, сёння публікуемых, падкрэсліваецца, што маскоўскія і ленінградскія пролетарыі, а разам з імі і ўсе працоўныя, нашай краіны ўспрынялі рашэнні аб адмене картачнай сістэмы на хлеб і некаторыя іншыя прадукты, а таксама аб пераўтварэнні палітадзелаў машына-трактарных станцый, як рэзультат палітычнага і гаспадарчага ўмацавання калгасаў і саўгасаў, як вынік буйнейшых перамог сацыялізма.

Яшчэ раз пацвярджаецца правільнасць палітыкі ленінскай партыі, узначальваемай сталінскім Цэнтральным Камітэтам. У той час, як Савецкі Саюз няўхільна ідзе наперад, паказваючы небывалыя ў гісторыі чалавецтва ўзоры гаспадарчага, тэхнічнага і культурнага прагрэсу, капіталістычны лад пястрымна коціцца ўніз, што вымушаны канстатаваць самі-ж ідэолагі і практыкі гэтага ладу. Нават рупар англійскай буржуазіі, лондонскі «Таймс», прызнае, што адмена картачнай сістэмы ў СССР «мае добрую перспектыву на пасляховае правядзенне». Разам з тым, гэта газета лічыць, што адмена картачнай сістэмы станоўча адаб'ецца на «ўнутраным, фінансавым і эканамічным жыцці Савецкага Саюза».

Наша краіна выглядала-б зусім інакш, калі-б мы, большэвікі, хоць на секунду адхіліліся ад ленінскага шляху. На працягу ўсіх гадоў рэвалюцыі было нямала людзей, якія імкнуліся збіць, звярнуць нас з гэтага шляху. Рабочы клас нашай краіны добра памятае гэтых капітулянтаў. І доўга не забудзе, бо ён бачыў і бачыць у іх сваіх злейшых ворагаў, подлых здраднікаў, якія стаялі і зараз стаяць за капіталістычны шлях развіцця Савецкага Саюза. Большэвіцкая партыя на чале з вялікім Сталіным да канца асталася вернай ленінскім заветам. Яна з такой-жа жорсткасцю, з такой-жа непрымірымасцю, як і Ленін, абрушвалася і абрушваецца на ўсіх ворагаў соцыялізма, яна нанесла сакрушальны ўдар і па троцкістах, і па зіноўеўцах, і па правых апартуністах, і па нацыянал-ухілістах.

І гэта цвёрдая, паслядоўная лінія сталінскага Цэнтральнага Камітэта прывяла нашу краіну да небывалых поспехаў. Большэвікі ўзнялі Савецкі Саюз на нецасляную вышыню. Ён стаў магутнай індустрыяльнай дзяржавай. Ён ператварыўся ў дзяржаву самага буйнога ў свеце земляробства. Ён становіцца краінай самага багатага і добрага жыцця. Ажыццяўленне рашэнняў лістападаўскага пленума ЦК аб адмене картачнай сістэмы на хлеб і некаторыя іншыя прадукты, а таксама аб пераўтварэнні палітадзелаў азначае новы гігантскі крок на шляху далейшага паляпшэння матэрыяльнага добрабыту працоўных горада і вёскі.

Упарта і настойліва вырашаючы гаспадарча-палітычныя задачы, наша партыя будзе яшчэ мацней згуртоўваць свае рады і ўвесь час трымаць порах сухім супроць астаткаў разбітых капіталістычных класаў, супроць астаткаў разгромленых антыленінскіх груп.

Таварыш Сталін, адзначаючы на XVII з'ездзе партыі агромадныя поспехі соцыялізма і небывалае ўмацаванне большэвіцкіх радоў, папярэджваў нас: «Ці значыць гэта аднак што барацьба скончана і далейшае наступленне соцыялізма ацтадае, як ліпняя рэч? Не, не значыць. Ці значыць гэта, што ў нас усё абстаіць у партыі добра, кіякіх ухілаў не будзе ў ёй больш і — стала быць — можна цяпер пачыць на лаўрах? Не, не значыць».

Класавы вораг канчаткова не дабіт. Яго агентура ўнутры партыі да канца не знішчана. Класавы вораг і яго агенты, затаіўшы звярыную нянавісць да савецкай улады, да партыі, а па меры росту соцыялізма, узмацняючы гэту нянавісць, разбітыя ў адкрытай палітычнай барацьбе, зусім ізаляваныя ад мас, уступілі на шлях самай вострай, крывавай барацьбы з савецкай уладай, на шлях індывідуальнага тэрору.

«Гнусныя, разлюшаныя агенты класавага ворага, подлыя падонкі былой зіноўеўскай антыпартыйнай групы вырвалі з нашых радоў таварыша Кірава». (З рэзалюцыі пленума МК з актывам).

Першаснежаньскі стрэл у Смольным у аднаго з буйнейшых дзеячоў нашай партыі і яе сталінскага ЦК, у лепшага саратніка і друга таварыша Сталіна, у кіраўніка ленінградскіх большэвікоў — тав. С. М. Кірава — канчаткова знімае маску са злейшых ворагаў ленінскай партыі і рабочага класа, подлых падонкаў былой зіноўеўскай антыпартыйнай групы. Дражнныя агенты класавага ворага аказаліся фізічнымі забойцамі пазацыра соцыялістычнай рэвалюцыі. Страляць у правадыроў рабочага класа, у сэрца яго партыі могуць толькі забойцы, падасланыя класавым ворагам, толькі заядлыя бандыты.

«Уся краіна і ўвесь рабочы клас будуць свята шанаваць памяць дарагога Міроныча» — заявіў на аб'яднаным пленуме ленінградскага абкома і гаркома тав. Жданаў, аднадушна выбраны ленінградскімі большэвікамі першым сакратаром ленінградскага абкома і гаркома.

Уся партыя, кожны комуніст, кожны комсамолец вышэй і вышэй падніміць сцяг рэвалюцыйнай пільнасці. Падонкі былой зіноўеўскай антыпартыйнай групы і ўсе іншыя заклятыя ворагі рабочага класа, якія дзейнічаюць супроць партыі і савецкай улады з-за вугла, не ганьбуючы ніякіх сродкамі, будуць выкарчоўвацца з коранем, без астатку.

Ворагам рабочага класа, ворагам партыі — ніякай літасці!

Партыйны актыў Масквы і Ленінграда прадэманстраваў высокую ідэйнасць большэвіцкіх радоў. Кожны комуніст павінен прасякнуцца пачуццём адказнасці за даручаную яму справу, пачуццём агромаднай класавай насцярожанасці.

Цясней рады партыі вакол вялікага сцяга Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна!

Няхай жыве сталінскі Цэнтральны Камітэт нашай ленінскай партыі!

Няхай жыве вялікі Сталін!

(Перадавы «Праўды»).

ПЛАН ІЛЬНОЗАГАТОВАК ВЫКАНАН НА 91,6 ПРОЦ.

Ход ільнозагатовак па БССР за апошнія пяць дзён не даў патрэбнага эфекту. На 15 снежня план ільнозагатовак выканан на **91,6 проц.** Прырост за пяцідзённку складае ўсяго 0,9 проц.

32 раёны поўнасцю выканалі план загатовак. Разам з тым рад раёнаў ільнаводчых раёнаў ганебна зрываюць важнейшае дзяржаўнае заданне. Вось гэтыя раёны.

Гарадоцкі раён выканаў план на 86,8 проц., **Горацкі** — на 80,8 проц., **Дубровенскі** — на 63,1 проц., **Мсціслаўскі** — на 70,7, **Чавускі** — 77,6, **Расонскі** — 84,9, **Быхаўскі** — 84, **Кармянскі** — 74,1, **Клімавіцкі** — 77,5 проц.

Топчыцца на месцы і такія раёны, як Асвейскі (92,9 проц.) Барысаўскі (91,3), Шклоўскі (93,6), Лёзненскі (89,1 проц.)

Па Совецкаму Саюзу

ПРЫВІТАННЕ ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

аб'яднанага пленума МК і МГК ВКП(б) сумесна з актывам

Дарагі таварыш **Сталін!** Аб'яднаны пленум маскоўскага абласнога і гарадскога камітэтаў партыі сумесна з актывам маскоўскіх большэвікоў шле табе, нашаму роднаму правадыру, натхняцелю і арганізатару вялікіх перамог соцыялізма гарачае прывітанне!

Маскоўскія большэвікі, рабочыя, калгаснікі і працоўныя, абмяркоўваючы рашэнні лістападаўскага пленума ЦК, горача ўхваляюць іх, як бліскучае пацвярджэнне правільнасці ленінскага шляху, па якому ты, тав. Сталін, з жалезнай упартасцю, паслядоўнасцю і настойлівасцю вёў і вядзеш нашу партыю, нашу краіну.

Маскоўскія большэвікі ўпэўнена заяўляюць, што яны з гонарам выканаюць рашэнні лістападаўскага пленума ЦК і твае ўказанні аб пырокім гандлі хлебам, далейшым разгортванні таваразвароту, умацаванні раёнаў і палепшэнні масавай партыйна - палітычнай работы.

Зарукай гэтаму — згуртаванасць маскоўскай партыйнай арганізацыі, беззаветная адданасць рабочых, калгаснікаў і працоўных нашай краіны ленінскай партыі і табе, т. Сталін!

Зарукай гэтаму — агромная палітычная актыўнасць, з якой рабочыя і працоўныя праводзяць выбары ў саветы, аднадушна выбіраючы кандыдатаў, высоўваемых нашай партыяй, з захапленнем выбіраючы цябе першым дэпутатам у маскоўскі совет.

15 дзён таму назад, калі каварны подлага забойцы, падасланага класавым ворагам, сразіў аднаго з лепшых кіраўнікоў партыі, твайго лепшага саратніка Сергея Міронавіча **Кірава**, уся партыя, рабочы клас, калгаснае сялянства з выключнай яркасцю яшчэ раз паказалі, як глыбока любоў і адданасць яго працоўнага народу да цябе, нашага правадыра і настаўніка, паказалі сваю жалезную рашучасць бязлітасна і да канца выкараніць астаткі разгромленых ворагаў.

На здрадніцкі стрэл контрэвалюцыйных наследкаў зіноўеўскай антыпартыйнай групы адзіным голасам адказвае ўся партыя, уся краіна:

Няхай жыве той хто павёў нашу вялікую партыю ў бой з усімі ворагамі ленінізма!

Няхай жыве той, хто штодзенна, штогадзінна вучыць усю партыю мастацтву распазнаваць ворага ў самым зародку і бязлітасна да канца разбіваць яго!

Няхай жыве той, хто забяспечыў перамогу нашай партыі і сталёзве адзінства большэвіцкіх радоў!

Няхай жыве наш родны, вялікі Сталін!

АБ УВЕКАВЕЧАННІ ПАМЯЦІ С. М. КІРАВА

ПАСТАНОВА АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМА ЛЕНІНГРАДСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ ВКП(б) АД 15 СНЕЖНЯ 1934 ГОДА.

У асобе паўшага на баявым пасту ад рукі класавага ворага **Сергея Міронавіча Кірава**, сакратара ЦК ВКП(б) і ленінградскага камітэта ВКП(б), ленінградскія большэвікі і ўсе працоўныя нашага горада і Ленінградскай вобласці разам з усёй партыяй і краінай панеслі найцяжэйшую і незваротную ўтрату.

З імем тав. Кірава неразрыўна звязан важнейшы этап у гісторыі ленінградскай партыйнай арганізацыі, яе самаадданай барацьбы за лінію партыі, за ленінізм, супроць правых і «левых» капітулянтаў.

З імем т. Кірава неразрыўна звязан рашаючы этап нашай барацьбы за пабудову соцыялістычнага грамадства. Пад кіраўніцтвам т. Кірава ленінградскія большэвікі арганізавалі мільённыя масы працоўных горада і вёскі на пераможнае ажыццяўленне праграмы разгорнутага па ўсяму фронту соцыялістычнага наступлення.

Кіруемыя тав. Кіравым ленінградскія рабочыя і работніцы ўпісалі яркія, незабыўныя старонкі ў гісторыю соцыялістычнага пераўтварэння нашай краіны.

Кальбель пролетарскай рэвалюцыі горад Леніна ўвянчаў сабе неўвядаемай славай у вялікіх будзях соцыялістычнай будоўлі. Усім гэтым мы абавязаны перш за ўсё тав. Кіраву і яго кіраўніцтву ўсёй нашай работай.

Тав. Кіраў увайшоў назаўсёды ў гісторыю пролетарскай рэвалюцыі, як адзін з яе выдатных арганізатараў і кіраўнікоў.

Рабочыя і работніцы, калгаснікі, навуковыя работнікі, інжынеры, тэхнікі, пісьменнікі, мастакі, настаўнікі і ўрачы на сваіх сходах высунулі шматлікія прапановы аб увекавечанні памяці С. М. Кірава.

Аб'яднаны пленум абкома і ЛК ВКП(б), у мэтах увекавечання памяці С. М. Кірава, пастанаўляе:

1. а) Перайменаваць Нарвскі раён у Кіраўскі раён і завод «Красный путиловец» — у Кіраўскі завод;

б) вуліцу Красных зор — у Кіраўскі праспект;

в) Крэстоўскі, Елагін і Каменны востраў — у Кіраўскія астравы, стварыўшы на іх узорную базу культурнага адпачынку працоўных;

г) пасюрыць будаўніцтва цэнтральнага парка культуры і адпачынку, прысвоіўшы яму імя тав. Кірава;

д) перайменаваць мост Равенства (былы Троіцкі) у Кіраўскі;

е) горад Хібінагорск перайменаваць у горад Кіраўск;

ж) пабудаваць у Ленінградзе ў 1935 г. помнік С. М. Кірава;

з) выдаць прамовы і артыкулы т. Кірава, а таксама кнігу, прысвечаную жыццю і дзейнасці тав. Кірава.

2. Пленум даручае ленінградскаму совету прыступіць да падрыхтоўчай работы па пабудове ў 1935 годзе помніка С. М. Кірава (выбар месца, распрацоўка праекту і т. д.), і заклікае ўсіх артыстаў, скульптараў і мастакоў прыняць актыўны ўдзел у стварэнні помніка С. М. Кірава.

ПАСТАНОВА МАСКОЎСКАГА СОВЕТА І АБЛВЫКАНКОМА

Выражаючы волю рабочых заводаў горада Масквы, грамадскіх і партыйных арганізацый аб увекавечанні памяці загінуўшага тав. **Кірава С. М.**, Маскоўскі совет, Маскоўскі абласны выканаўчы камітэт совета ў і Маскоўскі абласны і гарадскі камітэты ВКП(б) пастанаўляюць:

1. Перайменаваць **Замаскварэцкі** раён горада Масквы ў **Кіраўскі раён.**

2. Прысвоіць **заводу «Дынамо»** ў горадзе Маскве імя тав. Кірава С. М.

3. Перайменаваць **Мясніцкую** вуліцу ў вуліцу Кірава.

4. Перайменаваць **станцыю метрапалітэна** — «Мясніцкія вароты» ў Кіраўскую станцыю.



ПАРАВОЗЫ «ФД» — ГОНАР СОВЕЦКАГА МАШЫНАБУДАЎНІЦТВА.
На ілюстрацыі: паравозы «ФД», я кія ставяць на запраўцы на Луганскім паравозабудаўнічым заводзе.

КОНКУРС КОНЕГАДОЎЧЫХ КАЛГАСНЫХ ФЕРМ

МАСКВА, 17 снежня. (БЕЛТА). Падвезены вынікі ўсесаюзнага конкурса конегадоўчых калгасных ферм. Прызнаны пераможцамі конкурса і прэміраваны па 8 тыс. руб. 5 конеферм: калгас «Волна социализма» (Чалябінская вобласць), калгаса «Животновод» і імя Варашылава (Азова-Чорнаморскі край), калгасаў імя Дахадаева і «Кзыл Карангай» (Дагестан). Другія премій па 5 тыс. руб. атрымалі 7 конегадоўчых калгасных ферм і трэція прэміі—па 3 тыс. руб.—6 ферм.

РАДЫЁПЕРАКЛІЧКА З ПАЛЯРНІКАМІ

ЛЕНІНГРАД, 17 снежня. (БЕЛТА). З 15 снежня пачаліся рэгулярныя радыёперакліччі Ленінграда з палярнымі станцыямі совецкай Арктыкі. У першай перакліччы, арганізаванай Ленінградскім упраўленнем Паўночнага шляху і камітэтам радыёвяшчання ў адну галзіну ночы, прынялі ўдзел зімоўшчыкі мыса «Жаданіе», бухты Тіхая, Русская гавань, Матачкін Шар, астрава «Уединение» і іншых палярных станцый, а таксама каля 50 чалавек сваякоў і знаёмых зімоўшчыкаў. Зімоўшчыкі Матачкіна Шара падцвердзілі найлепшую чутнасць перадачы.

ВЫБРАНА 90 ПРОЦ. СЕЛЬСКІХ СОВЕТАЎ

МАСКВА, 17 снежня. (БЕЛТА). Згодна данных Цэнтральнай выбарчай камісіі, на 15 снежня па Саюзу выбрана 56.440 сельскіх советаў (90 проц.). На выбарчыя сходы з'явілася 83,6 проц. выбаршчыкаў (у выбары 1931 г.—70,4 проц.); явка жанчын на сходы—80,1 проц. (у мінулыя выбары — 63,4 проц.).

З 1.155.360 новых дэпутатаў — 26,8 проц. жанчын (у 1931 г. — 21 проц.), калгаснікаў — 73,8 проц. (у 1931 годзе—33,7 проц.), членаў і кандыдатаў ВКП(б)—18,9 проц. (у мінулыя выбары—14,3 проц.), комсамольцаў — 11,8 проц. (у мінулыя выбары—6,4 проц.).

Тав. А. А. ЖДАНАЎ САКРАТАР ЛЕНІНГРАДСКАГА АБКОМА ВКП(б)



БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

ЖДАНАЎ АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРАВІЧ радзіўся ў 1896 годзе, партыйны работнік—прафесіянал. У рэвалюцыйным руху з 1912 года. Вёў прапаганду марксізма ў Тверы. У партыю ўступіў у 1915 годзе. У часе вайны вёў большэвіцкую прапаганду сярод войск.

1917-1919 г.г. — член укома, таварыш старшыні і старшыня укома партыі (у г. Шадрынску б. Екацерынінбургскай губерні). У 1919-1922 г.г. — на ваенна-палітычнай, партыйнай і совецкай рабоце на Урале і ў Тверы. З 1922 года — старшыня Тверскага губвыканкома.

1924-1934 г.г. — на кіруючай партыйнай рабоце ў Горкаўскім краі: сакратар Нижагародскага губкома, сакратар Горкаўскага крайкома.

З XIV партз'езда — кандыдат у члены ЦК ВКП(б). З XVI — член ЦК. Пасля XVII з'езда — сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б).

Не раз выбіраўся у члены ВЦВК. Член ЦВК СССР.

ТАВ. М. М. ЛІТВІНАЎ ВЯРНУЎСЯ У МАСКВУ

Народны камісар па замежных справах тав. **М. М. Літвінаў** вярнуўся ў Маскву з Жэневы і ўступіў у выкананне сваіх абавязкаў.

(БЕЛТА).

УВАЙШОЎ У СТРОЙ МАЙКОПСКІ ЗАВОД НАТУРАЛЬНАГА КАЎЧУКА

РАСТОЎ-ДОН. 17. снежня. (БЕЛТА). 17 снежня майкопскі завод натуральнага каўчука адан у эксплаатацыю. Варачны, цэнтрафужны і вальцовы цэхі пачалі выраб першай партыі каўчука. Гатовы каўчук чакаецца 19 га.

Магутнасць завода—12 тон каўчука у суткі.

ЮБІЛЕЙ ПРАФ. АБРЫКОСАВА

МАСКВА, 17 снежня. (БЕЛТА). 16 снежня у маскоўскім Доме вучоных адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 35-годдзю навуковай і грамадскай работы заслужанага дзеяча навукі прафесара А. І. Абрыкосава. Выступіўшы з прывітаннем нам. наркома аховы здароўя РСФСР тав. Кангелары адзначыў выключныя заслугі юбіляра ў будаўніцтве совецкай аховы здароўя. З прывітаннямі юбіляру выступілі прадстаўнікі шматлікіх навуковых і грамадскіх арганізацый Масквы і Ленінграда.

На імя А. І. Абрыкосава атрыманы сотні прывітальных тэлеграм з усіх канцоў Саюза і ад буйнейшых вучоных ЗША, Францыі, Італіі, Германіі, Польшчы, Аўстрыі і Швейцарыі.

АБ ПЕРАНЯСЕННІ ТЭРМІНУ СКЛІКАННЯ III УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА РАБСЕЛЬКОРАЎ

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б

Адзначаючы, што ў выніку падрыхтоўчай работы да з'езда рабселькораў у большасці раёнаў БССР значна палепшылася арг. масавая работа з рабселькорамі, значна ўзрасла палітычная актыўнасць рабселькораў у барацьбе за паспяховае завяршэнне 1934 гаспадарчага года, ЦК КП(б)Б лічыць, што сур'ёзная штодзённая вучоба рабселькораў у гуртках і семінарах, выпучэнне рабселькораў на адказную совецкую, газетную і іншыя работы, своечасовае рэагаванне на пісьмы і карэспандэнцыі рабселькораў, і штодзённае жывое кіраўніцтва ніязвым насцендрукам у радзе раёнаў пастаўлены нездавальняча, а ў пасобных раёнах (Уваравічы, Сіроціна і іншыя) партарганізацыі кіруюць гэтым важнейшым участкам зусім дрэнна.

Выходзячы з указанага і ўлічваючы, што задача заключаецца ў тым, каб яшчэ больш мабілізаваць рабселькораў і мізавы друк БССР на паспяховае правядзенне ўсіх палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў 1935 года, а таксама ў сувязі з скліканнем ЦК ВКП(б) у снежні месяцы нарады рэдактараў краёвых, абласных і рэспубліканскіх газет, — ПРАВЕСЦІ III УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД РАБСЕЛЬКОРАЎ ПАСЛЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА І ЎСЕСАЮЗНАГА З'ЕЗДАЎ СОВЕТАЎ— 25 ЛЮТАГА 1935 ГОДА.

У сувязі з гэтым зацвердзіць наступны парадак дня з'езда.

1. Вынікі XI усебеларускага і VII усесаюзнага з'ездаў советаў і задачы друку і рабселькораў (даклад ЦК КП(б)Б).

2. Аб рабоце з рабселькорамі і рэагаванні на пісьмы працоўных (дакл. т. ЛЕНЦНЕР).

3. Аб задачах уздыму жывёлагадоўлі і падрыхтоўцы да пасяўной кампаніі 1935 года (дакл. БЕНЕК).

4. Задачы рабселькораў у барацьбе за якасныя і кошкасныя показальнікі промфінплана (дакл. тав. БАЛЦІН).

5. Работа ў секцыях:

а) па ільну і каноплях — кіруюць т.т. ЛЕНЦНЕР і ВАЙНОВІЧ;

б) па жывёлагадоўлі — кіруюць тт. СТРЭЛЕ і ШАСТАКОЎ;

в) па звышраннім сяўбе — кіруюць т.т. КАРАНЕЎСКІ і ЛЕБЕДЗЕЎ;

г) па прамысловасці — кіруюць т.т. ГОТФРЫД і ХЕЙФЕЦ;

д) па транспарту — кіруюць т.т. ГЕРШОН і ДЖЭЛЮК.

Да 25 студзеня 1935 года апублікаваць тэзісы, па якіх будзе праведзіцца работа ў секцыях, і арганізаваць на старонках цэнтральных і раённых газет абгаварэнне тэзісаў рабселькорамі. Прапанаваць кіраўнікам секцый прадставіць на бюро ЦК праекты сваіх тэзісаў да 20 студзеня 1935 года.

Абавязаць сакратароў РК КП(б)Б і рэдактараў раённых і рэспубліканскіх газет у дапамогай падрыхтоўцы да з'езда асаблівую ўвагу звярнуць на вучобу рабселькораў і работнікаў рэдакцый насценгазет, на жывую штодзённую дапамогу іх рабоце, выпучаючы лепшых рабселькораў на газетную і іншыя работы.

ЦК КП(б)Б падкрэслівае, што справа своечасовага рэагавання на сігналы газет і карэспандэнцыі і пісьмы працоўных як у часе падрыхтоўкі да з'езда рабселькораў, так і ў далейшай рабоце павінна стаць штодзённай справай усіх партыйных арганізацый.

АБ ДАМАХ СОЦКУЛЬТУРЫ

(АГЛЯД ПІСЕМ)

У снежні апошніх пастановаў ЦК ВКП(б) аб перабудове дамоў культуры, пленума ЦК ВКП(б) аб мітадзелах дамы соцыялістычнай культуры набываюць асаблівае значэнне, як цэнтры палітычна-масавай работы на вёсцы.

Надышла зіма. Калгасніц, калгасніца, калгасная моладзь в вялікай колькасці збіраюцца ў доме соцкультуры, у хаце-чытальні пачытаць газету, паслухаць лекцыю, радыё, атрымаць кнігу, агранамічную ці юрыдычную параду. Ці падрыхтаваліся дамы соцкультуры сустрэць гэты ўзрослы попыт калгасных мас на культурнае іх абслугоўванне?

З большасці раёнаў на гэта пытанне адказваюць адмоўна. Дамы соцкультуры і хаты-чытальні ў загоне. Як правіла, у зонах МТС палітадзелы ў мінулыя гады больш-менш наладзілі работу дамоў соцкультуры. Зараз з ліквідацыяй палітадзелаў паўстае пагроза спынення работы і ў гэтых дамах соцкультуры.

Ні соцыялістычнага, ні культурнага няма ў Турэўскім доме культуры. Тав. А. Флейтман нам піша:

«У доме соцкультуры брудна, што адбівае ўсякую ахвоту туды заходзіць. Бібліятэка амаль увесь час на замку. Ужо месяцаў з пяць як не было кіно-сеансаў. Моладзь вечарамі гуляе ў карты, бо няма куды зайсці, што паслухаць клрысн нага, пачытаць. Быў калісці таксама яўрэйскі дом соцкультуры, але варыз там склад Заготзярна. Ёсць у Тураве і аддзел радыёвяшчання. Але і ён нічога не робіць. Райком комсамола абмежаваўся пасылкай на работу ў дом соцкультуры двух комсамолак, якія там ані нічога не робяць і дарма грошы даяржаўныя атрымліваюць».

І гэта непасрэдна ў раённым цэнтры. І райком партыі і райвыканком у гэтым доме наладжваюць сходы, нарады, канферэнцыі. Але чамусні ніхто з раённых кіраўнікоў не патурбаваўся паглядзець, што робіцца ў гэтым доме соцкультуры тады, калі там сходаў няма.

Са Старобіна пішуць:

«Знадворку дом соцкультуры як бацькам віншто выглядае. А зой дзеш туды глянеш: вокны пабітыя, на падлозе бруд, сцены абшарпаныя. Часта ў дом заходзіць і старшыня райвыканкома тав. Мажнач і сакратар райкома тав. Баярчэнка, але ніхто з іх дагэтуль не задумаўся над тым, што трэба прывесці дом у парадак».

Толькі неахайнымі, нядбайнымі адносінамі да культурных запатрабаванняў шырокіх мас можна тлумачыць падобнае ігнараванне дамоў соцкультуры.

Парэшта ня дрэнна абсталёван дом соцкультуры ў калгасе «Рухавік», Сяржанскага сельсовета, Слуцкага раёна. Ёсць бібліятэка, шашкі, шахматы, нямала выпісваецца газет, кнігак, але якая карысць з гэтага, — пытае нас калгаснік М. Кражасевіч, — калі дом зачынены на замку, а загадчык Чуйко Змітрок верхаводзіць на ўсіх папойках?

Пры такіх адносінах да дамоў соцкультуры мы культурна-масавую работу безумоўна не наладзім і культурных запатрабаванняў вёскі не задаволім. Мы павінны дабіцца ва ўсіх раёнах такога становішча, каб замест работы дамоў соцкультуры сапраўды адповядаў іх ганаровай назве.

Гэта перш за ўсё значыць, што па свайму знадворнаму і ўнутранному выгляду дамы соцкультуры павінны быць узорам чыстаты і парадку. Гэта значыць, што дом соцкультуры павінен быць забяспечан святлом і опалам, каб сваёй утульнасцю ён вабіў калгасніка зайсці і пачытаць газету, кнігу, паслухаць лекцыю, даклад, паслухаць як настаўнік у голас чытае мастацкую літаратуру. Гэта значыць, што дом соцкультуры павінен мець пастаяннага, культурна развітага кіраўніка.

Новы помнік Чапаеву адлі у мастацкіх майстэрнях Ленінградскага совета. Помнік прадстаўляе копію помніка Чапаеву ў Самары, які ўжо быў адліт у майстэрнях Ленсовета ў 1932 г. НА ЗДЫМКУ: Дэталі Самарскага помніка — Чапаеў на кані і байцы-чапаеўцы.

ПАРТЫЙНАЯ ВУЧОБА НЕ АРГАНІЗАВАНА

МСЦІСЛАЎЛЬ. (Ад кар. «Звязды»).

У райкоме партыі сёлета зноў, як і летась, кляліся, абяцалі, што ўрокі мінулага года, калі партвучоба была сарвана, будуць улічаны, што 1934-1935 навучальны год у справе ўзброення комуністаў марксісцка-ленінскай тэорыяй будзе пераломным.

Нават прыказку пусцілі: «не ўладань тэорыяй Маркса-Леніна-Сталіна—гэта ехаць на адным коле веласіпеда». Але далей прыказак справа не пашла.

У горадзе быў створан семінар партактыва на 25 чалавек, пачатковая школа марксізма-ленінізма на 15 чалавек і кандыдацкая школа на 23 чалавекі. Астатняя частка комуністаў была ахоплена сеткай завочнага партыйнага навучання (соўпартшкола, комвуз). Як быццам усё ў парадку.

Але вось пачалася вучоба. У першы дзень заняткаў семінара партактыва — стопроцантная яўка. І канец. Больш заняткаў не было.

—Люцкі паехалі на раён, заняткі былі арганізавана сарваны.— кажа прапагандыст РК, загадчык неіснуючага партгабінета тав. Парашчанка.

Пачатковая школа марксізма-ленінізма і кандыдацкая школа сабраліся па тры разы з далёка нянпўным складам слухачоў. Больш яны не збіраюцца.

Такое становішча мы маем у горадзе, пад бокам і на вачах райкома. А што на вёсцы?

З 11-ці пачатковых школ марксізма-ленінізма і пяці кандыдацкіх правялі па адному-два заняткі толькі 8. Астатнія нават не займаліся зусім. Аб якасці кіраўнікоў гэтых неіснуючых школ гаварыць няжка.

Вясковыя комуністы не працуюць над сабой. РК КП(б)Б не дапамагае ім у гэтай справе.

Палітычны, культурны ўзровень вясковых партарганаў вельмі нізкі. Сідарэнка, парторг Пячонкаўскага сельсовета. 2 снежня аб гістарычных рашэннях пленума ЦК ВКП(б) ведаў толькі са слоў.

—Не чытаў яшчэ, няма калі,— прызнаўся ён чыстасардэчна.

Не чытаў і парторг Старасельскага сельсовета Паўловіч. Нічога не чытае палітычна пяграматны старшыня калгаса імя Гея Ларчанка, кандыдат партыі.

РК партыі сам зрывае партыйную вучобу,—тэарэтычную ўзброенасць членаў і кандыдатаў райпартарганізацыі.

Каб не быць галаслоўнымі, прывядзем факты.

Тав. Парашчанка кіраваў пачатковай школай марксізма - ленінізма. Правёў 3 заняткаў. Райком паслаў яго на раён. Прыехаў 6-га лістапада. 7-га паехаў. Прыехаў 26 лістапада і 28-га паехаў зноў. Ясна, што школа не прапавала. Тое самае было з кіраўнікамі астатніх школ.

Вывад. Ён напрошваецца сам. Партыйная вучоба штодзённая, крапатлівая работа на ўзбраенню комуністаў марксісцка-ленінскай тэорыяй, па павышэнню іх агульнай культурнасці, па ўзмацненню боездольнасці ўсёй партыйнай арганізацыі не атрымала правя грамадзянства ў Мсціслаўскага РК КП(б)Б.

В. АНЗТ.

ПАРТГАБІНЕТ—БЕЗ КІРАЎНІЦТВА

КАСЦЮКОВІЧЫ. (Па тэлефону ад карасп. «Звязды»).

У пачатку арганізацыі партыйнай вучобы «Звязда» сігналізавала аб тым, што касцюковіцкі партыйны габінет не рыхтуецца стаць асяродзішчам у арганізацыі вучобы ў раёне. У габінеце не было загадчыка. Габінет увесь час знаходзіўся на замку. Прайшло тарэлі часу, каб наладзіць работу габінета. Але РК партыі выпусціў з пад увагі гэты важнейшы ўчастак партыйнай вучобы. У габінеце па-ранейшаму няма загадчыка і ён больш закрыт на замку. Толькі ў дні партыйнай вучобы тут праводзіцца заняткі, а ў астатні час,— калі трэба падабраць матэрыял, пасядзець у ціхім і ўтульным пакоі, каб прапрацаваць яго, — гэтага нельга зрабіць. Габінет не абсталёван. Ён носіць выгляд звычайнай сялянскай некультурнай хаты.

Райком не ведае, што робіцца ў габінеце. А ў габінеце па разгортванню партыйнай вучобы нічога не робіцца.

ВІШНЕЎСКІ.

ПАДРЫХТАВАНЫМІ СУСТРЭЦЬ РАЗГОРНУТЫ ГАНДАЛЬ ХЛЕБАМ

ГАБІНЕТНЫМ ПАРАДКАМ...

Клімавіцкі райспажыўсаюз, згодна плана Наркомунтуртаргпалю, павінен адкрыць да 20 снежня 6 хлебных крам. Адну краму адкрывае леспрамгас.

Задача вельмі адказная. Аднак райсаюз фармальна, па-казённаму адносіцца да ажыццяўлення пастановы пленума ЦК ВКП(б) аб адмене картачнай сістэмы.

Старшыня райсаюза РАБІНОВІЧ 5 снежня, у самы разгар падрыхтоўкі да вольнага гандлю хлебам, невядома зачым выехаў у Мінск. Спачатку ён сябе застрахаваў, выдаўшы загад: «Пад асабістую адказнасць старшыні клімавіцкага гарпо тав. Пташнікава зараз-жа прыступіць да рамонту хлебапякарань і крам з такім разлікам, каб да 20 снежня скончыць рамонт. Нагляд за выкананнем гэтага загаду даручаю члену праўлення райсаюза тав. Лінкову».

Загад напісан 5 снежня, але патаемны зазнім числом — 30 лістапада. Такі ўжо «метад» работы тав. Рабіновіча: на ўсякі выпадак застрахавацца на некалькі дзён.

Зараз з рамонтам крам поўная неразбярыха.

Яшчэ горш справа з рамонтам пякарні. Частка пякарні яшчэ занята другой арганізацыяй. Для таго, каб пераасадзіць гэту арганізацыю ў другое памяшканне, необходна дазволіць пакой, які займае інструктар РК тав. Кантаўрава. Ёй прапануюць іншы пакой, але Кантаўрава заяўляе: «Дайце мне два пакоі, тады я пераасяляюся, інакш буду сядзець».

Пакуль ідзе сварка паміж горсоветам і Кантаўравай, а пякарня не рамантуецца. Старшыня РВК тав. Сільвестраў, даў распараджэнне старшыні горсовета Немціну выселіць Кантаўраву ў другі пакой, але Немцін не адважваецца. Так справа і не рушыцца з месца.

Яшчэ адзін характарны факт. РРБ вылучыў арганізацыйную камісію па падрыхтоўцы да свабоднага гандлю хлебам і прапанаваў ёй неадкладна прыступіць да рамонту магазінаў. У гэту камісію ўвайшлі заг. райгандлем т. Пеўзнер, старшыня райспажсаюза Рабіновіч і старшыня горспажыўсаюза Пташнікаў.

Пачалі работую сілу, пачалі рамонт, але раптам старшыня райсаюза спынім работы.

Пякарні не забяспечаны кваліфікаванымі кадрамі. Усяго ёсць 8 хлебапёкаў. Між тым райсаюз мае заданне выпякаць каля 7 тон хлеба ў суткі, а для гэтага патрабуецца 27 хлебапёкаў. Работа павінна будзе ісці ў тры змены.

У раёне ёсць спецыялісты па хлебапячэнню, але ні райспажыўсаюз, ні гарпо не выкідваюць іх, сядзяць у кабінетах і чакаюць, пакуль хлебапёкі самі прыдуць прапанаваць свае паслугі.

КУМОК, КАГАН.

ШУМУ МНОГА, СПРАВЫ МАЛА

У Барысаве праводзіцца шмат нарад аб падрыхтоўцы да разгорнутага гандлю хлебам.

Размоў хоць адбаўляй, а вось практычных спраў вельмі мала.

Хлебазавод са сваім абсталяваннем і кадрамі можа даць для горада дастаткова хлеба 4-5 гатункаў (жытні, пшсны, зажарны, рыжскі і менскі). Для выпуску здобных вырабаў ёсць былая саматужная пякарня на 10 пячэй. Пры поўнай нагрузцы гэта пякарня можа даваць штодзённа да 10 тон здобных вырабаў.

Але пякарню перш за ўсё трэба рэстаўраваць, добра адрамантаваць. І вось тут атрымалася затрэздка: няма матэрыялаў.

Увесь час вялася ведамственныя спрэчкі — хто павінен зрабіць рамонт. Узвальвалі ўсю работу на хлебазавод, а дырэктар хлебазавода тав. Міньковіч толькі разводзіў рукамі: дзе-ж я возьму матэрыялы?

Нарэшце, пасля рашучага ўмяшання райкома КП(б)Б удалося справу крыху крануць з месца. Знайшліся матэрыялы. Прыступілі да рамонту пякарні. Але дарэмна патрачанага дарагога часу, зразумела, не вярнуць.

Сур'ёзнай пагрозай з'яўляецца недахват кваліфікаваных хлебапёкаў, і асабліва булачнікаў і кандытараў. Пакуль што аб гэтым ніхто не думае.

У дырэктара хлебазавода Міньковіча акрамя нясмных меркаванняў нічога наконт падрыхтоўкі кадраў няма.

Вялікая адказнасць ускладаецца на гандлёвыя сістэмы — ЦРК і Белкарпгандаль. Нясвоечасовая падрыхтоўка магазінаў і ларкоў можа сарваць бесперабойнае спаджэнне 36-тысячнага насельніцтва Барысава хлебам. Трэба сказаць, што такая небяспека ў наяўнасці.

Пераважная частка магазінаў да работы не гатова. Асабліва дзіўна справа з адкрыццём новых магазінаў. Зноў-такі нерашчаснае вядамственная абмежаванасць. ЗРК, ЗВК упіраюцца, не жадаюць аслабяць вызначаныя пад хлебныя крамы памяшканні. Ідуць бясконцыя спрэчкі. А час праходзіць і тэрмін для рамонту змяншаецца.

Некалькі слоў аб транспарце. Да гэтага часу хлеб перавозіўся ў непрыстасаваных павозках, ад чаго ён псаваўся. Патрэбна зараз-жа прыступіць да пабудовы спецыяльных будак з паліцамі, каб хлеб і іншыя вырабы не брынькаліся, не цёрліся.

П. ЧЫКУН.

Захапіліся калгасным ростам калектывізацыі

МАЗЫР. (Па тэлефону ад палескага «карасп. «Звязды»).

Да верасня раённыя кіраўнікі сумавалі, што ў Мазырчыне не было калгаснага прыліву. У верасні то з аднаго те з другога сельсовета пачалі паведам яць аб масавым прыліве аднаасобнікаў у калгасы. А ў кастрычніку ў раённых кіраўнікоў ледзь зусім не закружылася галава ад поспехаў: за адзін месяц уступіла ў калгасы 1116 гаспадарак. У лістападзе, праўда, тэмпы прыліву крыху знізіліся. Але гэта не адбілася на настроі кіраўнікоў.

Зараз яны, можна сказаць, гарантуюць, што на Мазырчыне за яких-небудзь тры месяцы ў калгасы ўступіла больш 3.000 гаспадарак. Зразумела, што гэтыя поспехі атрыманы не самацёкам. Раённае кіраўніцтва і партарганізацыя у цэлым сапраўды палярнулася тварам да калектывізацыі. За апошнія тры месяцы сярод аднаасобнікаў была праведзена вялікая масавая работа, а ў калгасах была аработа спіна, якой многія гарадарні адгарадзіліся ад аднаасобнікаў.

Аднак, раённае кіраўніцтва зрабіла вялікую памылку, дапусціўшы разрыў паміж калгасным прыліванм і яго арганізацыйным умацаваннем. Калі раней многія калгасы адмаўлялі ў прыёме аднаасобніку за тое, што ў яго не хапала 2-3 кілограмаў насення, то зараз пры прыёме аб насенні, як правіла, зусім не ўспамінаюць. Гэта пытанне адкладаюць на рашэнне самога ўступаючага ў калгас аднаасобніка. Гэта надзвычай тонка можна праілюстраваць фактамі з калгасаў Слабодскага сельсовета, у якім прыліў быў самы найбольшы у раёне.

Узяць хоць-бы калгас «Калгаснік Мазырчыны». У яго ўступіла больш 30 гаспадарак. І толькі даве з іх часткова абагулілі свае насенне. Астатнія ўсе як адзін заяўляюць, што ў іх насення няма. Замест таго, каб да асобных, вясна ўходзячых ад абагульвання насенны прыняць самыя суровыя меры аж да перагляду пастановы аб прыёме ў калгас — праўдзіне на чале з старшынёй тав. Гнедзько пашло па лёгкім шляху. За ўсі шага суцэлаўлення. За ўсі прыліўшыя аднаасобнікі засталі насенныя фонды калгасным абожкам і бульбай, якоўны попіт працаўнікоў калгасніка больш чым на 100 грамаў зярна і больш кілограма бульбы.

Тое-ж адбыло ў калгасе «Чырвоная Беларусь» (той-жа сельсавет). Там засталі насенны фонд калгасным зярном за 48 аднаасобнікаў. Характэрная дэталь. Старшыня гэтага калгаса Гапчорык сам заяўляе, што 75 проц. усіх уступіўшых у калгасы аднаасобнікаў маюць насенне і могуць абагуліць, але ім аб гэтым пакуль нічога не гавораць.

Не абагульваюць уступіўшыя ў калгасы аднаасобнікі і фуражны фонд, галоўным чынам сена. Коней і валоў стаўлюць у калгасныя хлевы, а фураж выкідваюць сабе.

Слабодскі сельсавет — ня выключэнне. Неабагульненне насення і фуражных фондаў уступіўшымі ў калгасы аднаасобнікамі паўсюдная з'ява ў раёне. Аб гэтым ведаюць і райсамадзел, і райвыканком, і райком партыі. Захапіўшыяся колькаснымі паказчыкамі росту калектывізацыі, яны не разумеюць таго, што без неадкладнага гаспадарчага ўмацавання ногага прыліву, апошні можа ператварыцца ў масавы адліў.

ФРАЛОЎ.

З апошняй пошты

МАЙСТРЫ АД ХАЛТУРЫ

З некаторага часу нядбайны надпісчык з'явіўся на нашы газеты. Пасылае рэдакцыя «Калгасніц Белагусі» сваім падпісчыкам бясплатны дадатак «Лісток папаўнічага». Здавалася-б, што? «Дармоваму каню ў зубы не глядзяць». Бяры што даюць. Дык не, яшчэ скардзіцца чытач уздумаў. Асабліва з таго часу, як у гэтым лістку пачаў практыкавацца грамадзянін М. Цэлеш. То за поўным сваім подпісам, то за літарай «М», або «Ц», то за «МЦ», але ў кожным нумары лістка грамадзянін М. Цэлеш павінен абавязкова аб чым-небудзь расказаць сваім «бясплатным» чытачам.

У нумары 8 лістка М. Цэлеш знайшоў патрэбным расказаць пра аднаго загадчыка пунктам Белпушніны тав. Сарока. Якім гэта пунктам тав. Сарока загадвае, у якім раёне — аб гэтым Цэлеш на гэты раз ад сваіх чытачоў утаіў. На ўсякі выпадак ён гэту вестку адклаў да наступнага нумару. А мо' другой тэмы не будзе. Запас бяды не чыніць.

Пра работу тав. Сарока М. Цэлеш расказвае:

«За прымаўкам кіпіць работа. Тав. Сарока прымае пушніну, піша фактуры, выдае грошы».

Адным словам, Юлій Цэзар. А мала таго, дык ён — піша М. Цэлеш — сам да паляўнічых едзе, па вёсках бывае, як ідзе паляванне правяраце.

«Ён не заключыў нерэальных дагавораў з тымі паляўнічымі, якія любяць уапць але ўзамен не могуць даць пушнаны».

Вось так і ніводнага нерэальнага дагавору тав. Сарока не падпісаў. Во малайчына!

«Ён ведае не толькі тое, як выконваецца дагавор з брыгадай, але які паляўнічы адаў якую пушніну, колькі скурак, што атрымаў за гэта, што яму яшчэ належыць. Больш таго, ён наперад ведае, які паляўнічы якую пушніну яму прывезе».

Як гэта, грамадзянін Цэлеш, разумець: інтуіцыяй ці кнігай гэта Сарока бярэ? Вось вашэй паляўнічы ў лес, а Сарока ўжо наперад ведае, што абавязкова ліса прымае. А што калі на зайца ці на шашка паляўнічы патрапіць? Як яму ў такім разе быць, каб Сароку не падвесці?

У жаданні абавязкова выказаць, што Сарока сі жнец і ў дуду ігрэц і што ён безумоўны аўтарытэт ва ўсім раёне, М. Цэлеш расшыў паляўніц яго звышчалавечымі здольнасцямі, нешта чакіталу «жыцця святога Ягора», пра якога гэтымі днямі М. Кальцоў у «Правдзе» пісаў. Замест таго, каб паказаць сапраўднага ўзорнага работніка, ударніка, халтурщыкі тыпу М. Цэлеша маляваць «святых», якім пасля сораміна на вёску выйсці, каб суседзі, газету чытаўшы не засмялі яго...

Х. ДУНЕЦ

БІРАБІДЖАН—НЕАДЛУЧНАЯ ЧАСТКА СОВЕЦКАЙ РАДЗІМЫ

(ДА 1-ГА З'ЕЗДА СОВЕТАЎ ЯЎРЭЙСКАЙ АЎТАНОМНАЙ ВОБЛАСЦІ БІРАБІДЖАН)

Рабочыя і працоўныя, насяляючыя папраўічную Беларусь, радасна вітал пастанову совецкага ўрада аб ператварэнні Біраібіджанскага раёна ў яўрэйскую аўтаномную вобласць у складзе Далёка-Ўсходняга края.

Совецкая краіна—гэта сапраўдная і адзіная радзіма ўсіх працоўных, радзіма, якая ахоўвае і турбуецца аб патрэбнасцях працоўных усіх нацыянальнасцей.

Буржуазія не раз прабавала культываваць нацыянальную форму, і бю жаніцяваць. Гэта рабілася не раз таксама ў адносінах да яўрэйскай нацыянальнасці. Але школькі сутнасць, , напрамак, якіх пры гэтым заўсёды заставаліся буржуазнымі,— эксплаататарскімі і падпяволваючымі, гэта нацыянальная палітыка заўсёды азначала для шырокіх мас адну з форм агідная дэмагогіі.

Буржуазія імперыялістычных краін не раз эксплуатавала па словах не гатоўнасць абараняць патрабаванні нацыянальных меншасцей. Ліга-нацый таксама прабавала ажыццявіць гэту палітыку. Але заўсёды такое скарыстанне нацыянальнага сцяга ў руках буржуазіі служыла формай дакладнай і прыхаванай сапраўдных імкненняў сусветнага капітала наогул і яўрэйскіх капіталістычных груповак, у прыватнасці.

Сіяніізм, эксплаатаваўшы на працягу доўгіх дзесяткаў год адсталасць яўрэйскіх дробнабуржуазных мас і іх нацыяналістычныя ілюзіі, прынёсшы на працягу гэтых год у алтару англійскаму імперыялізму значную групу лёгкаверных элементаў з яўрэйскага насельніцтва,—сіяніізм на сваім сцягу напісаў лозунг: «К радзіме».

З максімальнай крыважэрнасцю сіяніізм эксплаатаваў гэты лозунг. Заклікаючы да ўласнага кутка ў «яўрэйскай краіне», «краіне бацькоў», сіяністы фактычна звалі яўрэйскія масы добраахвотна аддацца ў рукі англійскіх каланізатараў, ператварыцца ў нямую прыладу англійскіх каланізатараў, у нямую прыладу шавіністычнай бойні і крывапраліцьцяў на палях «святых айцоў». Пад лозунгамі «Зямлі Ізраіля», «яўрэйскай радзімы» англійскі імперыялізм атрымаў магчымасць патапіць стыхійныя ўзлёты рэвалюцыйнага руху Палестыны і перавесці барацьбу на рэйкі нацыянальных трэнняў, прытупляючы рэвалюцыйны націск мясцовага падняволенага сялянства.

Сіяністычны лозунг «К радзіме» прынцыпова базаваўся на агульным буржуазным нацыяналістычным лозунгу радзімы—абароны ўласнай нацыянальнай буржуазіі, за недатыкальнасць і права на абагачэнне за кошт працоўных. У гэтых мэтах сіяніізм пад гукі нацыяналістычнага гімну мабілізоўвае піонерскія атрады для калоніі Палестыны. Да якіх рэзультатаў прывёў шавіністычны лозунг «К радзіме»?

Мы перагортваем чарговую кніжку, прыходзячую нам у рукі*), якая ад свае становішча эміграваўшых у Палестыну яўрэйскіх каланістаў. Мы чытаем:

«Калонію «Мішмер Гэярдэн» («Стража Іардана») мясцовыя яўрэі пачалі будаваць пры дапамозе рускіх аматараў Сіона. Дзве-тры старыя хаціны, маленькая і мізэрная палоска зямлі, перапоўненая каменнем і цёрнам, што знаходзіцца сярод балот Іардана,—і перад намі калонія з гучным імем «Мішмер Гэярдэн». Потым ужо ЕКО (яўрэйскае каланізацыйнае т-ва) дакладзіла каланістаў зямлёй і пабудавала дамы. Але гэтае «дабаўка» таксама была недастатковай, і калонія цягне сваё існаванне на палову за кошт фінансуцэнага падтрымання і напалову за кошт Цфаскай падачкі».

Так выглядае матэрыяльны добрабыт у «яўрэйскай радзіме» сіяністаў. Але можа гэтым каланістам, якія жывуць у галечы, прывіваецца пачуццё самастойнасці, можа яны сябе адчуваюць гаспадарамі на новай зямлі? Мы чытаем далей па той-жа крыніцы:

«Каланісты не мелі права распараджацца ні ў сваёй калоніі, ні на палях або ў агародзе, і нават у сваёй уласнай хаце. Без дазволу начальства яны не мелі права пакінуць чалавека ў сябе начаваць. Каланісты былі, улсна, пішнім прыдаткам да калоніі».

Рабы ў сваёй уласнай «яўрэйскай радзіме»—вось чым былі і астаюцца яўрэйскія працоўныя, якія перасяліліся ў «святэнную краіну». Але можа быць яны ў гэтай краіне знаходзяцца па-за ўсякай небяспекай нацыянальнага ўціску і нацыянальных сутычак? Не, наадварот: яны ў гэтай краіне становяцца прыладай праследвання слабых народнасцей і гэтым яны ставяць сябе пад пагрозу стаць аб'ектам варожасці для мясцовых нацыянальнасцей і плямення. Зноў звяртаемся да вышэй цытаванага аўтара, які нам у бытавых рысах расказа аб «салідарным» сужыцці народаў у краіне «малака і мёду».

«Калі эфендзі (памешчык) прадае сваю зямлю яўрэю ці еўрапейцу, фелах вымушан вставіць свой кавалачак зямлі, над якім яго продкі ўсё свае жыццё працавалі, бедную хібарку, у якой ён радзіўся і вырас. І сядзіць, пасаджаны ім і яго жонкай. У вёсках, якія прадаюцца яўрэйскім каланізацыйным таварыствам, разгрываюцца душераздзіраючыя сцэны, якіх гісторыя не ведала з часу жудасных выгнанняў яўрэяў, вядомых нам з старажытнай яўрэйскай гісторыі».

Будуючы сіяністычную (буржуазную) радзіму на крыві і касцях фелахскіх плямення, вытанючы ў імя імперыялізма сялянскую бедноту з наседжаных гібад, яўрэйскія кулак-каланісты Палестыны прадстаўлялі сабой яркі ўзор разбуральнай дзейнасці каланізатарскай палітыкі, і ў сваёй рэвалюцыйнай барацьбе фелах паказваў астрыё сваёй барацьбы супроць англа-сіяністычнай каланізацыі.

«Друзы з Метулы, — чытаем мы,—у дакумэнце, апісваючым каланізацыю Палестыны—эсныі бедныя, і калі іх выгналі з вёсні, яны адразу апынуліся ў надзвычай цяжкім , с ,ечы, хоць кожны з іх атрымаў па некалькі сот марак. І яшчэ адно: пасля таго, як яны пакінулі сваю калонію, якая адзначалася сваім здаровым і прыемным паветрам, яны знайшлі часовае прыстанішча ў друзскай вёсцы, у даліне Хаелес—на поўнач ад Май-Меройм, дзе лютуе балотная ліхаманка, і такім чынам многія з іх захварэлі гэтай хваробай... Таму яны пачалі пагражаць капоніі і аднаго разу яны стралялі ў адзін з дамоў. Аднаго разу яны напалі на яўрэя, спаўшага ў сваім свірні, і забілі яго; таксама было, калі едабралі пару валоў у каланіста, працаваўшага на полі».

Такі «нацыянальны мір» у «яўрэйскай радзіме», якая будуецца сіяністамі і знаходзіцца пад пратэктаратам Англіі. Гэты кашмарны малюнак раскрывае агідныя бакі імперыялістычнай гвалтоўнасці ў калоніях. Не дзіва таму, што аборона англійскай адміністрацыі недастатковая, і таму кожны кулак-каланіст развівае фізічную барацьбу за «радзіму», кіруючы метады свайго гаспадара.

«На палях і ў садах гэтай мясцовасці можна знайсці адзнакі, якія гавораць аб тым, што яны належаць яўрэйскай калоніі. Вы тут усюды знойдзеце групы згорбленых арабаў, апрацоўваючых зямлю сваімі «фішкамі», і над імі стаіць яўрэйскі наглядчык з «курбачом» (бізуном) у руках, які подбадзёрвае «пяных арабаў» крыкам: «ялла, ялла». Бывае таксама, калі строгі наглядчык выклікае саграшыўшага арабскага рабочага і збівае яго ў прысутнасці астатніх рабочых, якія глядзяць на гэту сцэну вагнядышачымі вачамі і сціснутымі зубамі».

Такімі метадамі сіяністычнага набыцця калаваткаў «радзімы» па законе выражэння галоднага жыцця падняволеных плямення. Сіяністы ведалі вецер і пажынялі буру. У англійскіх калоніях расце рэвалюцыйны рух. І сярод барацьбітоў супроць імперыялізма пямага рэвалюцыйных яўрэйскіх перасялегнаў-пролетарыяў, адчуўшых «добраджэйчны» падобнай «бацькаўшчыны».

Пролетарская рэвалюцыя ўдарыла па сусветнаму шавінізму і Совецкая краіна стала жывым помнікам інтэрнацыяналізма і сапраўднай свабоды ўсіх нацыянальнасцей. Тут таксама сіяніізм за ўсіх яго формах атрымаў смяротны ўдар, ад якога яму ўжо ніколі не ўдасца справіцца. Колькі-б не прабавалі рознага роду яўрэйскія нацыяналісты абнаўіць сіяністычныя забабоны, ім гэта ўжо не ўдасца. Іх карта біта.

Сіяністы і шавіністы розных масцей ставіць стаўку на мястэчка. Яны гаварылі: беднае мястэчка гаспадарча не можа быць адбудавана, яно прадстаўляе сабой «груду попелу»; неабходна шукаць асобы выхад для яўрэйскага народу, выхад самабытны, па-за агульным развіццём Совецкай краіны.

Гэта карта яўрэйскіх шавіністаў прайграна і партыя выкрыла ўсіх шавіністаў і апартуністаў, спекулявуўших на гэтай спадчыне царызма. Мястэчка зараз набыло іншае аблічча, змяніўся яго жыццёвы стыль. Мястэчка багача пашло на дно, канула ў вечнасць фігура патрыярхальнага рабіна.

Ёсць новае мястэчка—мястэчка кааператываў, школ, калгасаў, саматужных арцелей, МТС, дзяржаўных млынаў і лесазаводаў, мястэчка новых знатных людзей—ударнікаў і ўдарніц, партыйцаў і комсамольцаў, калгаснікаў і кааператараў, настаўнікаў і агранамаў.

Няма ўжо яўрэйскай беспрацоўнай моладзі і дэкласаваных непрадукцыйных элементаў. Замест іх вырасла армія працаўнікаў, рабочых вугальных капальняў, металістаў, транспартнікаў, будаўнікоў, механікаў, электрыкаў, тэхнікаў, калгаснікаў, кавалераваных саматужнікаў, інжынераў. «Памёр стары бал гофіле».

Толькі на фоне гістарычных перамог партыі і совецкай улады ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяго СССР былі магчымы гэтыя дасягненні ў галіне пераўтварэння аблічча рабочых і працоўных мас яўрэйскай нацыянальнасці. Толькі на гэтым фоне можна ва ўсёй велічы апісаць стварэнне аўтаномнай яўрэйскай вобласці ў Совецкай краіне. Гэта яшчэ адзін бліскучы доказ, што СССР з'яўляецца радзімай усіх працоўных, што толькі ў краіне пролетарскай дыктатуры магчыма поўная ліквідацыя астаткаў прыгнечаных нацыянальнасцей, магчым рост і росквіт нацыянальных культур, сацыялістычных па зместу і нацыянальных па форме.

Яўрэйскі нацыянал-сепаратызм атрымаў смяротны ўдар. Цесная сувязь яўрэйскіх рабочых і калгаснікаў са сваімі братамі іншых нацыянальнасцей, будаўніцтва Біраібіджана, на аснове брацкага супрацоўніцтва працоўных усіх нацый, з'яўляецца пропіндзем яўрэйскаму шавінізму, апартуністам, недаацэньваючым небяспекі яўрэйскага нацыяналізма, апартуністам, якія імкнуцца змазаць гэту небяспеку, даказваючы, што, маў, яўрэйскі шавінізм «па сутнасці сваёй з'яўляецца выключэннем з агульнага правіла аб тым, што нацыяналізм можа ператварыцца ў дзяржаўную небяспеку, калі з ім не вядзецца адпаведная барацьба».

Кітаец, карэец, украінец, яўрэй, тунгус, рускі, беларус—усе яны салідарна працуюць, бо яны цэментаваны ідэяй соцыялістычнага будаўніцтва, соцыялістычнай радзімы. Будаўніцтва соцыялізма ліквідуе нацыянальную абмежаванасць, зближае рабочых і працоўных розных нацыянальнасцей.

*) Якаў Меерзон. Арабы і яўрэйская каланізацыя ў Палестыне. Выдавецтва «Мир», Масква.

НОВЫЯ ДЭПУТАТЫ МЕНГОРСОВЕТА

Тав. ПІЛЕЎСКІ — рабочы-ўдарнік закройнага цэха швейнай фабрыкі «Окцябр» (злева). Тав. ШТАНЮК А. — майстар слясарна-загатоўчага цэха трампарка, парторг парка, герой першай пяцігодкі, рабочы стаж 15 год (справа).

НА РАЁННЫМ З'ЕЗДЗЕ СОВЕТАЎ

Крытыка „наогул"

ЛЕПЕЛЬ. (Ад спецыяльн. карэсп. «Звязды»).

Аб тым, што ў Лепельскім раёне самакрытыка не разгорнута, што яе не любяць і нават баяцца «Звязда» пісала яшчэ ў жніўні. Закончыўшыйся 13 снежня VII раённы з'езд советаў яшчэ раз пацвердзіў, што так яно ў сапраўднасці і ёсць.

Раён суспрэў свой з'езд рапам прарываў у выкананні асноўных сельскагаспадарчых кампаній. Не гледзячы на магчымасць поўнасцю завяршыць ільнозагатоўкі, план ільну па раёну да з'езда выкананы на 97,3 проц.

Выключна вялікі прарыў у развіцці жывёлагадоўлі. У параўнанні з 1929 годам конская пагалоўе зменшана на 34 проц., буйная рагатая жывёла — на 20 проц., і свінні — на 49 проц. План укамплектавання стада па раёну за 1934 год, за выключэннем буйнай рагатай жывёлы, таксама не выкананы.

Раённы з'езд советаў чакаў ад асноўных дакладчыкаў (старшыні райвыканкома тав. Запоркіна і начальніка райза тав. Бадунова), глыбокага аналізу прычын прарыву, але дэлегаты гэтага не пачулі.

Зусім незразумелым для дэлегатаў быў даклад нам. старшыні райвыканкома тав. Лагойскага, аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаванні калгасаў і далейшай калектывізацыі. Дакладчык не ўказаў ні на адно канкрэтнае мерапрыемства, якое паўплыне спрыяць далейшаму арганізацыйна - гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў. Голае пералічэнне трактарнага парка, фіксацыя вялікіх дасягненняў і прарываў, нацягванне гістарычных архіўных фактаў — вось стрыжань яго даклада.

У спрэчках па справаздачнаму дакладу райвыканкома выступае загадчык райана тав. Фільмановіч. Палову сваёй прамовы ён пяе дыфірамбы аб дасягненнях Лепельшчыны на народнай асвеце. Ён гаворыць: «Хоць поспехі ў гэтай галіне наш раён мае аграмадныя, але... пастановы ЦК партыі аб школе мы не выканалі. Школы дровамі не забяспечаны, матэрыяльная база школ дрэнная, слабае метадычнае кіраўніцтва, падручнікаў па грамадазнаўству і хіміі ёсць у вельмі абмежаванай колькасці, зусім слаба барацьба з малаграматнасцю; малаграматных лічыцца ў раёне звыш 5000 чалавек, з іх каля 3000 чал. ледзь умеюць расписацца і т. д., і т. д.».

У такт Фільмановічу выступае 1 старшыня гарпо тав. Койдзін. Канстатуючы дрэнную работу каапорацыі, ён не палічыў патрэбным сказаць аб практычных мерах, прымаемых гарпо ў справе разгортвання хлебнага гандлю ў сувязі з ліквідацыяй хлебных картак. У гэтых адносінах ён абмежаваўся ў бяздзейнасці райвыканком, хоць разам з райвыканкомам бяздзейнічае і апарат гарпо.

З выключна аціднай прамовай у спрэчках па дакладу тав. Захаркіна выступіў начальнік райза тав. Гадуноў. Ён асмеліўся выступіць па пытанню аб самакрытыцы ў раёне. Але як? Сваёй прамовай, насычанай жартамі і прыбаўткамі, ён ператварыў гэта сур'ёзнае пытанне ў нейкую кукальную камедыю. «Калі-б — гаворыць — мяне хоць раз як след пажаралі, тады-б можа і рэагаваў на газетныя заметкі» і т. д., і т. д. Яго выступленне, лігаральна, абурыла ўсіх дэлегатаў з'езда.

Зусім інакш выступалі старшыні сельсоветаў і іншыя дэлегаты з'езда. Яны ўскрывалі сапраўдныя прычыны наяўных прарываў у раёне, патрабавалі ад новага складу райвыканкома прыняцця канкрэтных мер для забеспячэння поўнага і добраякаснага выканання рашэнняў партыі.

Сваю работу з'езд закончыў выбарамі новага складу пленума РВК і дэлегатаў на ўсебеларускі з'езд советаў з ліку лепшых старшынь сельсоветаў, старшынь калгасаў калгаснікаў, калгасніц, загадчыкаў ферм і раённага актыва.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

БАРАЦЬБУ ЗА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІЮ — ПАДМЯНІЛІ ПАСТАНОВАМІ І НАРАДАМІ

Стыль «работы» розны, а вынікі адны: пастановы райкома і самаабвінавачальствы нарад пры палітаддзеле падпываюцца ў справы; несвядомая-ж жывёла ад гэтага не множыцца, ёй нават ні сытна і ні цёпла ад папер.

У пастанове ад 5 лістапада бюро Мсціслаўскага райкома партыі «лічыць, што гаспадарчае будаўніцтва ў калгасах знаходзіцца ў нездавальняючым становішчы». Мякка, надзвычай асцярожна сказана.

Ці можна назваць толькі «нездавальняючым становішчам» такі факт, калі на гэты час у раёне не было скончана будаўніцтва 12 канюшань, 17 кароўнікаў і 10 свінарнікаў?

Пункт трэці пастановы сурова «абавязвае райза, МТС, сельсоветы і праўленні калгасаў на працягу дэкады закончыць усё нескончанае будаўніцтва ў калгасах, «прыняць меры», «забяспечыць», «ліквідаваць»...

Прайшла не дэкада, а пэлы месяц. Заглянем па адну з ферм, паглядзім, што змянілася пасля райкомаўскай пастановы.

Вось калгас «1 май», Старасельскага сельсовета. Тут СТФ. У ёй налічваецца 77 свіных галоў. Але як яны разглядаюцца?

Свінарнік—суцэльнае балота, вакенцы не асцеклены, праз сцены, як праз рэшата, можна бачыць, кравіў з усіх бакоў.

Загадчык фермы, комуніст Маскалёў, старшыня калгаса, комуніст Масалёў не чыталі пастановы райкома. Аб самаабвінавачальствах, даных палітаддзелу МТС яны забылі. Райкомаўцы-ж і палітаддзельцы не знаходзяць патрэбным праверыць на месцы, на ферме, выкананне сваіх пастаноў і калгасных самаабвінавачальстваў.

Затое райком партыі на пасяджэнных бюро робіць від, што сістэматычна займаецца жывёлагадоўлай. Вось і 22 лістапада бюро райкома ў парадак дня ўключыла пытанне аб жывёлагадоўлі. Улас на кажучы ніякага пытання не абгаварвала бюро. Бюро заслухала... адну рэзалюцыю намесніка загадчыка райза Старасціна І, аб радыкальную меру палепшэння справы жывёлагадоўлі, сакратар райкома партыі ўнёс прапанову скараціць рэзалюцыю ў 2-3 разы. Новая пастанова ў новай, скарочанай, рэдакцыі ўвойдзе ў архіўныя матрыялы райкома.

А. И.

Жыёлагадоўля навыварат

ПОЛАЦК. (Ад карэсп. «Звязды»).

Апошнія дні базары Полацка і мястэчка Ветрына, Полацкага раёна, перапоўнены мясам. Вязуць на рынак мяса калгасы, калгаснікі і аднаасобнікі. На рынках прадаюць кароў, авечак і пялят.

Пакуль у раёне збіраюцца пісаць чарговую рэзалюцыю аб уздымё жывёлагадоўлі, у калгасах пачалі рэзаць цялят і авечак. Загадчык фермы калгаса «Чырвоны араты» Казлоўск зарэзаў сваё цяля. Услед за Казлоўскім пачалі рэзаць сваіх цялят і іншыя калгаснікі. У калгасе «Окцябр», Замшанскага сельсовета, зарэзана двое цялят. Павезлі прадаваць сваіх цялят і ягнят калгаснікі калгасаў Кушлікоўскага сельсавета. У калгасе імя Чарвякова двое цялят пайшлі пад нож. Нямала цялят і ў іншых калгасах раёна пайшло пад нож.

Аб тым, што гэта так, сведчаць лічбы загатоўленых цялячых скур. За апошні месяц райкат, Заготскур і арцелі промкааперацыі загатовілі больш 300 цялячых скурак. Нядарма дырэктар райката тав. Кавалеўскі ганарыцца, што план па цялячых скурах ён заўсёды перавыконвае. Яму ў гэтым дапамагае РК КП(б)Б і райвыканком, якія не прымаюць ніякіх мер да тых, хто знішчае маладняк.

Да гэтага часу ў калгасах раёна не ведаюць аб ільготах калгаснікам і працоўным аднаасобнікам, гадуючым цялят на кампрактацыі.

Н. И.

АЗДАРАВІЦЬ КАЛГАС ІМЯ АПАНСКАГА

(Ліст селькора)

Мы, полацкія калгаснікі-селькоры, прабылі дзесяць дзён у Паташынскім сельсавеце, Гарадоцкага раёна. Тое, што мы бачылі ў калгасе імя Апанскага гэтага раёна, прымушае нас напісаць у «Звязду», каб раённыя і цэнтральныя арганізацыі заняліся гэтым калгасам.

Калгас імя Апанскага—адзін з буйнейшых у раёне, яднае больш 80 гаспадарак, але безгаспадарчасць тут на кожным кроку. Асабліва гэта адбіваецца на жывёлагадоўлі. 96 цельных кароў стаяць у халодным неацепленым хляве. Цялятнікаў і радзільных памяшканняў у калгасе няма. 37 свіней стаяць у брудных свінаркіках. Корм, які выдаецца свінням, расцягваецца. З 67 коней 58 абмулены. На 67 рабочых коней ёсць толькі 20 хамутоў і 15 калёс. Калёсы і колы разбіты, амаль ніколі не падмазваюцца. Дагэтуль коні не замацаваны за калгаснікамі.

Калгас мае 230 гектараў сенажаці, якія даюць магчымасць поўнасцю забяспечыць жывёлу грубымі кармам. Але ў выніку выключнай безгаспадарчасці 100 га сенажаці не было скошана, 5 га скошанага і высушанага сена пагніло на полі. Сена ў пуках не ахоўваецца, яго расцягвае кожны, каму толькі ахвота. Насенная канюшына ляжыць неабмалочанай і таксама расцягваецца. У выніку жывёла забяспечана кармамі толькі на 50 проц.

Калі мы больш падрабязна прааналізавалі прычыны гэтага, то аказалася, што ў калгасе знайшлі прытулак кулакі і лішэнцы. Так, дагэтуль у калгасе налічваецца больш 10 раскулачаных гаспадарак, выключаных з іншых калгасаў. Загадчыкам фермы з'яўляецца жонка стражніка Бутухова. Не дзіва, што на ферме за апошні месяц загнула 8 цялят. Конюхам працуе кулак Гагака, які за коньмі зусім не глядзіць. Нямала кулакоў і на іншых кіруючых пасадах.

Практыка гэтага калгаса паказвае, наколькі раённае кіраўніцтва не ўваходзіць у дэталі калгаснай вытворчасці, не ведае людзей, якія знаходзяцца ў калгасах.

Селькоры Полаччыны
БАЛЮТКА, НІКАНДРАЎ.

ПРЫГАВОРЫ ВАЕННАЙ КАЛЕГІІ ВЯРХОЎНАГА СУДА САЮЗА ССР У ГОРАДЗЕ КІЕВЕ ПА СПРАВАХ АБ ТЭРАРЫСТАХ-БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАХ

13—15 снежня гг. выязная сесія ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР, пад старшынствам тав. Ульрых В. В. у складзе членаў калегіі тт. Рычкова Н. М. і Гарчова А. Д. разгледзела ў гор. Кіеве справы: 1) Крушэльніцкага А. В., 2) Бачынскага Ю. А., 3) Крушэльніцкага І. А., 4) Крушэльніцкага Т. А., 5) Сказінскага Р. Ф., 6) Лебедзінец М. М., 7) Шэўчэнка Р. І., 8) Карабут А. Ю., 9) Сідарава П. І., 10) Місіка В. А., 11) Левіцкага В. І., 12) Скрыпа — Казлоўская А. І., 13) Касынка — Стрэлец Г. М., 14) Фалькоўскага Д. Н., 15) Оксаміт М. Г., 16) Шчэрбіна А. Г., 17) Тарашчэнка І. П., 18) Буравога К. С., 19) Казлёва Л. Б., 20) Гельмер-Дзідушок П. Ф., 21) Влызько А. Ф., 22) Фіяцкага А. І., 23) Дзмітрыева Е. К., 24) Багдановіч А. А., 25) Бутузава П. І., 26) Бутузава І. М., 27) Пятніца В. В., 28) Блачэнка Я. П., 29) Ступіна Г. К., 30) Палевога Д. І., 31) Хопцяр І. О., 32) Барэцкага П. Н., 33) Лук'янава Л. І., 34) Працэнка Г. Н., 35) Пўненка К. І., 36) Мат'яш С. Я., 37) Ляшэнка А. К.—па абвінавачанню ў арганізацыі падрыхтоўкі тэрарыстычных актаў проць работнікаў совецкай улады.

Суд устанавіў, што большасць абвінавачаных прыбыла ў СССР праз Польшчу, а частка праз Румынію, маючы заданні па правядзенню на тэрыторыі УССР раду тэрарыстычных актаў.

Пры затрыманні ў большасці абвінавачаных адабраны рэвольверы і ручныя гранаты.

Кіруючыся пастановаю прэзідыума ЦВК Саюза ССР ад 1 снежня гг. і арт. арт. 54—8 і 54—11 К. К. УССР, выязная сесія ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР.

ПРЫГАВАРЫЛА:

1. СКАЗІНСКАГА Рамана Фёдаравіча, 2. КРУШЭЛЬНІЦКАГА Івана Антоновіча, 3. КРУШЭЛЬНІЦКАГА Тараса Антоновіча, 4. ЛЕБЕДЗІНЕЦ Міхаіла Майсеевіча, 5. ШЭЎЧЭНКА Рамана Ільіча, 6. КАРАБУТ Анатолія Юр'евіча, 7. СІДАРАВА Пятра Іосіфавіча, 8. КАСЫНКА—СТРЭЛЕЦ Грыгорыя Міхайлавіча, 9. ФАЛЬКОЎСКАГА Дзмітрыя Ніканоравіча, 10. ОКСАМІТА Міхаіла Гаўрылавіча, 11. ШЧЭРБІНА Александра Гаўрылавіча, 12. ТЭРЭШЧЭНКА Івана Петровіча, 13. БУРЗЭВОГА Канстанціна Сцепанавіча, 14. ВЛЫЗЬКО Алексея Федаравіча, 15. ДЗМІТРЫЕВА Еўгенія Кузьміча, 16. БАГДАНОВІЧА Адама Адамавіча, 17. БУТУЗАВА Парфірыя Іванавіча 18. БУТУЗАВА, Івана Майсеевіча, 19. ПЯТНІЦА Владзіміра Васільевіча, 20. БЛАЧЭНКА Якава Паўлавіча, 21. ПАЛЕВОГА Дамініка Іосіфавіча, 22. ХОПЦЯР Івана Ануфрыевіча, 23. БАРЭЦКАГА Петра Нікалаевіча, 24. ЛУК'ЯНАВА Леаніда Іванавіча, 25. ПЎНЕНКА Канстанціна Іванавіча, 26. ПРАЦЭНКА Гаўрыла Нікіціча, 27. МАТ'ЯШ Сергея Якаўлевіча, 28. ЛЯШЭНКА Александра Карнеевіча—

РАССТРАЛЯЦЬ.

Маемасць усіх канфіскаваць.

ПРЫГАВОРЫ ПРЫВЕДЗЕНЫ Ў ВЫКАНАННЕ.

Справы: Крушэльніцкага Антона Владзіслававіча, Бачынскага Юр'яна Александравіча, Місіка Васілія Александравіча, Левіцкага Васілія Іванавіча, Скрыпа — Казлоўскай Анны Іванаўны, Казлёва Леўко Барысавіча, Гельмер — Дзідушок Петра Фёдаравіча, Фіяцкага Александра Іванавіча і Ступіна Герберта Карпавіча — ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР, з прычыны высветліўшыхся новых абставінаў, пастанавіла НАКІРАВАЦЬ НА ДАСЛЕДВАННЕ.

(БЕЛТА).

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ

САКРАТАРУ БЕШАНКОВІЦКАГА РК КП(б)Б тав. КАЖДАНУ.

ДЛЯ РАБОТНІКАЎ БЕШАНКОВІЦКАГА РАЙЗА ЗАКОН НЕ ПІСАН

(Пісьмо калгасніка).

Пастановы ўрада аб забароне выдачы калгасным коней для паездак розных прадстаўнікоў, як відаць, не датычаць работнікаў бешанковіцкага райза. Інструктар райземаддзела тав. Путухоў патрабаваў ад старшыні калгаса «Камбайн» Грыцкевіча даць яму каня на раз'езды па Усвейскаму сельсовету.

Тое-ж робіць і намеснік загадчыка райземаддзела т. Бандзвіч. Прыязджае ў калгас «Камбайн» і патрабуе даць каня для раз'ездаў.

Такія факты ў Бешанковіцкім раёне не адзінкавыя.

С. ПАЛАВЕНКА.

САКРАТАРУ КЛІЧАЎСКАГА РК КП(б)Б тав. ЦІШКЕВІЧУ

КЛІЧ УСЕ РВК ІГНАРУЕ ПАСТАНОВУ СОЎНАРКОМА

(Пісьмо работніка леспрамгаса).

Згодна пастановы Соўнаркома, Клічаўскі райвыканком павінен выдзеліць Быхаўскаму леспрамгасу на 1934 год 100 падвод і 75 лесарубаў.

Але старшыня райвыканкома Дзейко ігнаруе пастанову СНК. Замест своечасовага забеспячэння Быхаўскага леспрамгаса рабочай сілай, ён нажіраваў вызначаную рабгужсілу для работы ў сваім раёне. Гэтым самым зрываецца выкананне плана вывазкі дроў рабочым цэнтрам.

ЦУРАН.

САКРАТАРУ ЛЕПЕЛЬСКАГА РК КП(б)Б тав. ХІЖАНКОВУ.

„НЯХАЙ ПАДСЫПЛЕ СНЯЖКУ"

(Пісьмо служачага).

У Лепельскім раёне не аддаюць увагі загатоўкам і вывазцы лесу. Страхавога матэрыялу загатоўлена 14,7 проц., і дроў 36 проц.

Тэлеграма ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб узмацненні тэмпаў лесазагатовак не ўлічана месцовымі арганізацыямі.

РВК абмежаваўся тым, што перадрукаваў і разаслаў тэлеграму па сельсоветах і на гэтым супакоіўся.

Старшыні сельсовета і калгасаў займаюцца балбатнёй, гаворачы «няхай падсыпле снежку, тады будзем вазіць дровы».

БАЗЫЛЁНАК.

Нам пішуць

Тав. Мезень паведамляе, што па настаўніку Асіпавічы зрываецца ліквідацыя непраграматнасці і малаграматнасці РВК і райзана гэтым пытаннем не займаюцца. Яны не адпусцілі грошай для выплаты настаўнікам зарплаты за ліквідацыю непраграматнасці.

Ужо трэці месяц як настаўнікі Свісловіцкага сельсовета (Асіпавіцкі раён) не атрымліваюць зарплаты. Тут пастанова СНК аб своечасовай выплаце настаўнікам зарплаты ігнаруецца.

Аб гэтым паведамляе настаўнік тав. Л. РУБІНШТЭЙН.

Па слядах выступленняў «Звязды»

„Раз'юшаны класавы вораг тэрарызуе селькораў"

Пракуратура рэспублікі паведамляе, што ёю камандзіраван прадстаўнік на месца для расследвання фактаў, прыведзеных у пісьме 17 снежня гэтага года).

Па слядах пісем

„АРЦЕЛЛЮ КІРУЮЦЬ ЗЛАЧЫНЦЫ"

Пад такім загалоўкам было змешчана пісьмо («Звязда» ад 16-X-34 года), у якім гаварылася аб разбазарванні кіраўніцтвам арцелі сродкаў і маемасці арцелі.

Згодна паведамлення прэзідыума Белкаапсаюза старшыня арцелі «Трэці год пяцігодкі» (Горкі) Прэсман з работы знят і аддан пад суд.

„Юравіцкія педагогі"

Пад такім загалоўкам 6 кастрычніка ў «Звязде» было змешчана пісьмо селькора Такевеля аб тым, што загадчык дзіцячага дома імя Варашылава Стасенка разам з іншымі работнікамі кожны дзень п'янствуюць, прымяняюць фізічныя меры ўздзеяння на дзяцей, разбазарваюць прадукты, якія адпускаюцца для харчавання дзяцей і т. д.

Мазырскі райпракурор паведамляе, што факты, указаныя ў пісьме, поўнасцю пацвердзіліся. Загадчык дзіцячага дома Стасенка і выхавальніца Цімохава з работы зняты. Для палепшання матэрыяльна-бытавых умоў дзяцей адпушчана 10 тыс. руб.

„Выбітыя вокны, дзіравы столь"

Пад такім загалоўкам у «Звязде» 13 лістапада г. г. было змешчана пісьмо настаўнікаў Кудраўца і Пехоменка аб тым, што ў бабруйскай напоўнай сярэдняй школе пабітыя вокны, печы разваліны, школа не забяспечана дровамі і настаўнікі не маюць кватэр.

Петрыкоўскі РВК паведамляе, што ў школе зроблен рамонт, і школа забяспечана дровамі на зіму. Настаўнікі кватэрамі забяспечаны.

На 1935 год школа ўключана ў план капітальнага рамонту.

МІХ. БРОЦКІ

АБ ТВОРЧАСЦІ праф. ЗАЛАТАРОВА

У пачатку студзеня 1935 г. споўніцца 35-годдзе кампазітарскай і 45-годдзе педагагічнай дзейнасці заслужанага дзеяча мастацтва прафесара-кампазітара Васілія Андрэевіча Залатарова.

Творчая біяграфія Залатарова — гэта шлях вялікага талантлівага майстра, які ўжо з 1905 г. ідзе на зближэнне з пролетарыятам. Залатароў з'яўляецца выхадцам з пролетарскай сям'і. Музычная дзейнасць яго пачынаецца з 10 год, калі ён за добры голас пападае ў неўчую капелу.

Кампазітарская дзейнасць Залатарова пачынаецца з 1899 г. У першы перыяд сваёй творчай работы ён знаходзіцца пад уплывам Балакірава і Рымскага-Корсакага, «вучнем якіх ён з'яўляўся. Раннія творы першага перыяда носяць сляды ўпливу «кучкістаў» (такавы з струнных квартэты, 2 увертюры і яўрейская рапсодыя). У далейшым Залатароў ужо ідзе па свайму шляху, пакінуўшы ўпливу дэкадэнтаў, быў шага такім значным у тую эпоху. Творчасць Залатарова гэтага перыяду незвычайна эмацыянальна і насычана. Ён адлае многа ўвагі лірыцы і народнаму песенчаму фальклору. Побач з соцыяльна-насычанымі рэчамі, накшталт «Платья короля» («Король весь в пурпуре, как будто кровь на нём») — такі прыпеў гэтага твору, у свой час забароненага царскай цэнзурай) можна сустрэць радарэчаў на тэкст Фета («Шопот, робкое дыханье»).

Тав. ЗАЛАТАРОЎ

У перыяд рэакцыі пасля 1905 г., калі большасць кампазітараў замкнулася ў «эстэцтве», ставячы вышэй за ўсё эратычныя праблемы, Залатароў, не гледзячы на репрэсіі царскага ўраду і нават на байкот музычных «субратоў», з усім уласцівым яму тэмпераментам і эмацыянальнасцю піша рэчы, аллюстроўваючыя гераічныя бае пролетарыята на барыкадах 1905 года.

Залатароў верыць у надыходзячыя перамогі рабочага класа. Гэтай верай сагрэты яго дастаткова шматлікія творы, прысвечаныя 1905 году. (Фортэпіанная крыж, сімфонія «1905 год», вакальныя творы «Перад зарэй». «Мы долго лежали повергнуты в прах», «Скуй мне сердце, кузнец»).

Окцябрская рэвалюцыя і перыяд грамадзянскай вайны праходзяць у напружанай педагагічнай рабоце, у рабоце па ўцягванню шырокіх працоўных мас у музычныя навучальныя ўстановы, і толькі свабодны час аддаецца творчасці.

Залатароў належыць да таго ліку кампазітараў, якія прынялі Окцябр без хістанняў, і актыўна ўключыўшыся ў справу стварэння пролетарскай музычнай культуры, і гэтым самым ён дыскрэдытаваў французскую пагаворку, шырока ўжываемую ў гады грамадзянскай вайны сярод адсталай часткі музычнай інтэлігенцыі, што «калі грымяць гарматы, музы маўчаць». Васіль Андрэевіч сваёй творчасцю ў перыяд ваеннага комунізма ва ўвесь голас заявіў, што калі грымяць гарматы, музы з класавых пролетарскіх барыкад утораць ва ўвесь акорд сваёй музычнай магутнасці і сваёй эмацыянальнай усхваляванасцю арсенал музыкі.

У 1925 годзе кампазітар Залатароў стварае вялікі манументальны твор — оперу «Дэкабрысты», па сутнасці першую совецкую оперу. Пісаць рэвалюцыйную оперу ў тый час, як і зараз задача была выключнай па труднасці. Стыль совецкай оперы яшчэ не быў знойдзен, ён толькі яшчэ намацваўся. У раволюцыйнай оперы, ды яшчэ з гістарычным сюжэтам, неабходна захаваць цэлы рад оперных спецыфічных асаблівасцей. Трэба даць рэвалюцыйны пафас (не збіваючыся, аднак, на імпэатэтыку), трэба захаваць гістарычную перспектыву, уключыць агітацыйны элемент без упадання аднак у крыклівую плакатнасць. Для заваявання ўвагі слухачоў неабходна таксама перна звязаць рэвалюцыйны сюжэт з цікавай фабулай. Усіх гэтых элементаў Залатароў у сваёй оперы дабіўся, знайшоў тыя патрэбныя гукавыя фарбы ў пералачы снежаньскага паўстання гераічных дэкабрыстаў, гэтым самым правільна музычна, ніторычна вырашыўшы гэтую цяжкую і складаную тэму.

1925 год знаменуецца прыездам на работу на Украіну. Прафесарская дзейнасць у ВНУ, падрыхтоўка раду талантлівых маладых украінскіх музыкантаў перапляцаецца з вялікай прадукцыйнай творчай дзейнасцю ў стварэнні музыкі, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу.

У 1926 годзе выходзіць опера на украінскім матэрыяле «Хвеско Анцыбор», якая карыстаецца, дзякуючы шукаццям надзвычайнай музыкі, заслужанай репутацыяй. Потым рад сімфанічных рэчаў на тэму народных украінскіх песень.

Разгорнутая партыйна-гіганцкая работа на Урале па будаўніцтву Магнітагорска і іншых сусветных аб'ектаў, прыцягнула творчую ўвагу Залатарова. І ён прыязджае ў Свердлоўск, дае цалкам пераключаецца на стварэнне музычнай навучальнай установы і астатні свабодны час прысвячае творчай рабоце. Тут ён стварае цэлы рад песень, рапсодый, сюіт, якія кармоцюцца аграмадзнай папулярнасцю не толькі ў асноўных цэнтральных рабочых раёнах Магнітагорска, Куазнецка, Челябінска, Надзежынска, Златаўста, але і ў такіх аддалёных рабочых раёнах, як Табольск. Усе гэтыя музычныя творы адбіваюць гераічную работу партыі і пролетарыята ў будаўніцтве другой металургічнай базы. У асаблівасці заслужанай репутацыяй па Урале карыстаецца цыкл песень, напісаных к 15-й гадавіне Окцябра, прысвечаных уральскім комунарам. З вялікім поспехам была сустрэта музыка Залатарова на памяць Леніну, напісаная з вялікім эмацыянальным узлётам. У сувязі з юбілеем Асобай Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі Залатароў напісаў рамане «Краснознаменный» і на абарончую тэматыку «Готовься к бою».

Жывучы і працуючы на Урале, Залатароў не забывае нацыянальна адсталыя рэспублікі, і да ўсесаюзнага конкурсу на нацыянальныя песні, арганізаванаму у Маскве, прадстаўляе узбекскую сюіту «Фергансці марш» і цэлы рад распрацаваных таджыкскіх песень, за што атрымлівае першую прэмію. У той-жа час выходзіць у Маскве «первая русская кніга «Фуга». Да гэтага часу гэта кніга перакладалася на рускую мову в нямецкай музычнай літаратуры. Кніга «Фуга» — гэта вялікая капітальная тэаретычна даследчая праца, цалкам напісаная на аснове вопытну работ совецкіх педагагічных музычных навучальных устаноў. Кніга выклікала ў музычных колах Захаду вялікае ўхваленне. Апрача таго ім напісана опера для дзяцей, якая карыстаецца вялікім поспехам, і, не гледзячы на сваю даўнасць, да гэтага часу ідзе ў Ленінградскім дзіцячым тэатры.

Залатароў выехаў на Урал, каб збіраць матэрыял для сваёй оперы, прысвечанай стварэнню новых соцыялістычных гігантаў. Аднак, ён за працаваць адным з лепшых музычных раёнаў і, уцягнуўшыся ў культурную работу растучага краю, адыграў вялікую ролю ў развіцці музычнай культуры Урала, вялікі інтэнсіўнай работай у справе стварэння музычнай культуры. За які-небудзь год напісана больш 20 рэчаў: масавая песня для хору на словы Александровіча, пяць народных беларускіх фальклорных спеваў для хору, польская народная песня, фантазія для фортэпіяно і аркестра, пяць музычных карцін на беларускую тэму, тры народных песні, музыка к п'есе «Канец дружбы», дзесяць харавых песень, і, нарэшце, сімфонія «Аб героях Арктыкі», якая складаецца з 4-х частак: першая частка рысуе гераічны паход і гібель «Чэлюскіна», другая частка прысвечана апісанню прабывання чэлюскінцаў на дрэйфуючай ільдзіне; тэма трэцяй часткі — выратаванне чэлюскінцаў, чацвертая частка — фінал — рысуе ўрачыстае сустрэчу чэлюскінцаў дамоў. Слава героям Арктыкі!

Сімфонія з вялікім узлётам перадае эпізоды гераічнай палярнай эпапеі.

У творчым сектары Саюза совецкіх мастакоў у Маскве сімфонія быстрэйшай ігнаруе. Аднак, ён за працаваць адным з лепшых музычных раёнаў і, уцягнуўшыся ў культурную работу растучага краю, адыграў вялікую ролю ў развіцці музычнай культуры Урала, у масава-рабочага музычнага руху і ў справе ўмацавання оперыага тэатра ў Свердлоўску, які зараз прызнан Наркомасветы РСФСР народным і лепшымі акадэмічнымі тэатрамі Масквы і Ленінграда. Залатароў пакінуў прыклад, таго, якую аграмадзную карысць у справе культурнага, у прыватнасці музычнага выхавання шырокіх мас можа зрабіць буйны кампазітар, які перанёс сваю дзейнасць на пераферыю, у рабочы раён, дзе яго творчасць расце і развіваецца.

Нязначны тэрмін прабывання Залатарова ў Беларусі знаменуецца вялікай

За рубяжом

ПАДРАБЯЗНАСЦІ АПОШНІХ АРЫШТАЎ У ГЕРМАНІІ

ЛОНДАН, 16 снежня. (Інфармацыя «Праўды»). Судзячы па апошніх вестках, атрыманых тут з Берліна, акалічнасці і прычыны звальнення з пасады і арышту сілезскага намесніка Брукнера ўсё яшчэ акружаны найстражэйшай тайнай. Усё-ж некаторыя падрабязнасці, якія праліваюць святло на гэту справу, выплылі наверх. Дакладна вядома, што Брукнер быў арыштаван на аэрадроме ў Тэмпельгофе ў момант прыбыцця з Брэслаўля ў Берлін. Арышт зроблен па распараджэнню Гітлера.

Стала таксама вядома, што адначасова з арыштам Брукнера ў Берліне было арыштавана 200 нацыянал-соцыялістаў, пераважна кіраўнікоў штурмовых атрадаў. Арышты былі зроблены таксама і сярод кіраўнікоў «Саюза гітлераўскай моладзі». Лік арыштаваных дасягае 150.

Спяшаюць, што Брукнер прабаваў скалаціць уласную арганізацыю і вербаваў прыхільнікаў сярод штурмавікоў, членаў ахоўных атрадаў і «Саюза гітлераўскай моладзі».

Як відаць, арышт Брукнера быў зусім нечаканым. Нават Фрык — міністр унутраных спраў — не быў, мабыць, паінфармаваны ў гэтай справе. Напярэдадні арышту Фрык сказаў у Бейтэне (Сілезія) прамову, у якой даслоўна заявіў: «Ваш дзейны абер-прэзідэнт і абласны кіраўнік партыі заслугоўвае асобай падзякі. Пад яго ўмелым кіраўніцтвам Верхняя Сілезія ператварылася ў магутны плацдарм нацыянал-соцыялізма на Ўсходзе».

У Лондане цыркулююць чуткі, што Брукнер расстралян.

ГЕРОЙ АСТУРЫЙСКАЙ КОМУНЫ ЗАХВАЧАН У ПАЛОН

ПАРЫЖ, 16 снежня. (Інфармацыя «Праўды»). Каля Міерэса ў Астурыі карным атрадам іспанскай жандармерыі захвачан у палон адзін з баявых кіраўнікоў астурыйскіх гарнякоў — сяржант Васкес.

У першы-ж дзень усеагульнай стачкі, калі гарнякі ўзяліся за зброю, Васкес, які служыў у 3-м пяхотным палку ў Овіедо, прыняў актыўны ўдзел у руху. Ён быў назначан камандзірам аднаго з рабочых атрадаў, прымаўшых удзел у баі пад Кампаманосам, дзе былі разгромлены ўрадавыя войскі. Гэты бой прывёў да пераможнага штурму Овіедо і захвату яго гарнякамі. Васкес уваходзіў у рэвалюцыйны камітэт у Овіедо, які кіраваў абаронай сталіцы Астурыі, і аставаўся на пасту да апошняга моманта — да ўступлення ў горад каланіяльных войск генерала Очоа.



Французская пліта супроцьпастаўляе рэнай абароны праводзіна 2 снежня ў Парыжы показальныя практыкаванні. НА ЗДЫМКУ: аўтамабіль першай дапамогі пліты на вуліцах Парыжа.

БЯСЧЫНСТВЫ ЯПОНСКАЙ ВАЕНШЧЫНЫ НА КІТАЙСКА-УСХОДНЯЙ ЧЫГУНЦЫ

ШАНХАЙ, 13 снежня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Харбіна, 11 снежня прыстаў пасяловай паліцыі разам з японскім сонетнікам і пры ўдзеле рускага паліцэйскага патрабавалі ў начальніка будынка ключы ад чыгуначнага сабрання на ст. Шуанчэнцу. Пасля таго, як начальнік заявіў, што ключоў у яго няма, з'явіўшыеся апалілі ўнутры замок і праніклі ў будынак. У будынку быў зроблен абыск.

13 снежня ўвесь інвентар чыгуначнага сабрання на ст. Шуанчэнцу быў выкінут пасяловай паліцыяй на вераніду пры клубе.

11 снежня на ст. Пагранічная японскі афіцэр прапанаваў зачыніць к наступнай раніцы кватэру памочніка начальніка ўчастка цяні Палашова.

12 снежня быў арыштован рахункавод участка цяні Леонцьеў. У той-жа дзень чыны пагранатрада (японец і рускі) пад пагрозай прымянення зброі адабралі ў начальніка 3-га ўчастка ключы ад кватэры Палашова, перадаўшы начальніку ўчастка арыштаванага Леонцьевым. Пасля гэтага кватэра Палашова была занята чынамі пагранічнага паліцэйскага атрада.

Тав. Руды паведаміў аб гэтым у праўленне КУЧ з просьбай прыняць рашучыя меры к спыненню гвалтоўных дзеянняў, утвараемых чынамі японскіх войск пры садзейнасці чыгуначнай паліцыі.

***

ШАНХАЙ, 13 снежня. (БЕЛТА). Згодна вестак з Харбіна, 4 снежня чынамі японскага ваеннага камандавання гвалтоўна заняты на ст. Сюсуй фынь (Усходняя лінія КУЧ) кватэра начальніка станцыі Мальчэнка, рэчы якога выкінуты на вуліцу, і кватэра старшага рамонтнага рабочага Жыур.

ПОЛЬСКА-РУМЫНСКАЕ ГАСПАДАРЧАЕ ПАГАДНЕННЕ

ВАРШАВА, 15 снежня. (БЕЛТА). Учора падпісана польска-румынскае гаспадарчае пагадненне, якое ўносіць рад паправак у польска-румынскі гандлёвы дагавор. Паводле слоў румынскага міністра гандлю Маналеску — Струнг, у яго гутарцы з Бекам было закрануты пытанне аб стварэнні румынскай свабоднай зоны ў Гдынскім порце. Румынія разглядае такую зону, як выходны пункт для пранікнення румынскіх тавараў у паўночныя краіны. Учора Маналеску-Струнг выехаў з Варшавы ў Берлін.

АУГАНА-ПЕРСІДСКІ ПАГРАНІЧНЫ КАНФЛІКТ

ТЭГЕРАН, 16 снежня. (БЕЛТА). Усе персідскія газеты публікуюць паведамленне аб буйным узброеным пагранічным канфлікце. У паведамленні ўказваецца, што 4 снежня група аўганскіх бандытаў, сярод якіх знаходзіліся вядомыя асобы — афіцыяльныя чыны і пават аўганскія салдаты напала на Зорабад, разграбіла звыш 25 вёсак і гвалтоўна ўвяла на аўганскую тэрыторыю 2 тыс. персідскіх сялян. Апрача таго, імі было разброєна 12 персідскіх жандараў пагранічнага паста Поль-Хедці. Забіты па дарозе 3 жандары і ўнесена ў Аўганістан казённая зброя. Страты насельніцтва пагранічных персідскіх паселішчаў дасягаюць 500 тыс. туманаў.

Персідскія газеты заклікаюць персідскі ўрад «не аставацца маўклівым сведкай падзей». «Паміта» газета «Іран» — трэба рашуча прасеч гэту ўзброеную агрэсію і пусціць у ход свае збаронныя сродкі».

Па Совецкай Беларусі

РАЁННЫЯ З'ЕЗДЫ СОВЕТАЎ

12 снежня закончыў работу VII з'езд советаў Дзяржынскага раёна. У рабоце з'езда прымаў удзел старшыня ЦВК СССР і БССР тав. ЧАРВЯКОЎ.

З'езд працаваў два з паловай дні. Ён заслухаў справаздачу старшыні РВК тав. ВАНСОЎСКАГА, які падрабязна спыніўся на дасягненнях раёна за перыяд паміж VI надзвычайным і VII з'ездамі советаў.

Выступаўшыя ў спрэчках адзначылі рад недахопаў у рабоце раёна, асабліва ў галіне рэзіцыя жыхарства і таварообароту.

ПЕРШЫМ ДЗЛЕГАТАМ ДЗЯРЖЫНСКАГА РАЁНА НА УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД СОВЕТАЎ ВЫБРАН ТАВ. ЧАРВЯКОЎ.

К—н.

***

ОРША. (Па тэлефону).

Адкрыўся VII з'езд советаў Аршанскага раёна. У першы дзень на з'езд з'явілася 420 дэлегатаў з 430.

З'езд вітаў дэлегацыі рабочых чыгункі, інвалідкамбіната, вайсковых часцей, піонераў. Ад імя совецкіх пісьменнікаў з'езд вітаў тав. Крапіва.

Пасланы прывітальныя тэлеграмы тт. Сталіну, Молатаву, Калініну, Варашылаву, Гікало, Галадзеду, Чарвякову.

МІКУЦКІ.

***

МСЦІСЛАЎЛЬ. (Па тэлефону).

Кароткай уступнай прамовай адкрыў з'езд советаў старшыня райвыканкома тав. Рай. Бурай апладысментаў сустрэлі дэлегаты прапанову выбраць ганаровым старшынёй з'езда таварыша Сталіна.

З'езд вітаў дэлегацыі рабочых прадпрыемстваў, соўгасаў, калгасаў раёна і піонеры.

***

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону).

16 снежня ў 7 гадзін вечара адкрыўся VII раённы з'езд советаў Барысаўшчыны. На з'езд прыбыла 350 дэлегатаў.

З'езд стоячы ўшанаваў памяць заліквідаванага на сваім пасту тав. С. М. Кірава.

З'езд паслаў тэлеграмы прывітаньня партыі і працоўных усяго свету таварышу Сталіну, ленінградскім рабочым, панёсшым цяжкую ўрату, ЦК КП(б)Б — т. Гікало і т. Варашылаву.

***

ЖЛОБІН. (Па тэлефону).

У чыгуначным клубе імя Окцябра адкрыўся VII раённы з'езд советаў. На з'езд прыбыла 227 дэлегатаў, з іх рабочых 34, калгаснікаў 58, жанчын 47.

КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ДЭПУТАЦКУЮ ГРУПУ МЕНГОРСОВЕТА.

Менгорсовет ухваліў ініцыятыву дэпутацкай групы завода «Большэвік» аб уключэнні ў соцспаборніцтва на лепшую пастаноўку работы дэпутацкіх груп і прапанаваў усім дэпутацкім групам уключыцца ў спаборніцтва.

Менгорсовет устанавіў для лепшай дэпутацкай групы пераходны сцяг, а таксама выдзеліў 3 прэміі: у 1500 руб., 1000 руб. і 500 руб.

ПРЫЕЗД ЛАТЫШСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

У БССР на працягу двух тыдняў знаходзіцца вядомы латышскі пісьменнік Лінард Лайцен. Гэтымі днямі ў Менск прыбылі латышскія совецкія пісьменнікі Эвард Салмек і Юлія Яньль.

15 снежня ў Доме пісьменнікаў адбыўся вечар, прысвечаны латышскай і літоўскай літаратурам.

16 снежня пісьменнікі выехалі ў Выхаўскі і Віцебскі раёны.

У сувязі з пастановай пленума ЦК ВКП(б) аб адмене хлебных картак у г. Менску разгорнуте будаўніцтва хлебных магазінаў.

НА ЗДЫМКУ: абсталяванне хлебнага магазіна на рагу вуліц Совецкай і Урыцкага.

ХАРЧОВЫ КАМБІНАТ У МЕНСКУ

Завод «Чырвоны хімік» рэканструюецца ў харчовы камбінат спажывецкай кааперацыі. Камбінат будзе працаваць на мясцовай сыравіне і ў 1935 годзе выпусціць прадукцыі — фруктовага чаю, кофе, эсэнцыі, крухмалу і інш. на 10 млн. руб. Камбінат будзе пушчан у пачатку студзеня.

30 ГРУЗАВЫХ МАШЫН ДЛЯ КААПЕРАЦЫЙНЫХ ХЛЕБАПЯКАРАНЬ

Цэнтрасаюз выдзеліў 15 грузавых аўтамашын для раённых каапераціўных хлебапякарань Беларусі. Апрача таго 15 грузавых машын адпушчана для хлебазаводаў. Менскі хлебкамбінат атрымлівае 3 новыя машыны.

ВЫДАННЕ КЛАСІКАЎ ПОЛЬСКАЙ ПАЭЗІІ

Інстытут польскай пролетарскай культуры Беларускай Акадэміі Навук распачаў падрыхтоўку да акадэмічнага выдання твораў класікаў польскай паэзіі Славацкага і Міцкевіча.

Першы зборнік выбраных твораў Славацкага і вядомая паэма «Пан Тадэуш» Міцкевіча выйдуць з друку ў 1935 годзе.

НОВЫЯ ПАСТАНОЎКІ 1-ГА БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРА

2 студзеня 1 Беларускі дзяржаўны тэатр адкрыўшы сваю работу ў Менску. У новым сезоне тэатр паказа прем'еры «Жыццё кліча» — Біль-Бельцэрыкоўскага, «Сімфонія гневу» — Шапалевіча, «Вялікадушша» — Галаўчынера і «Як яе завуць» — Адуева. Пастаноўшчык апошніх двух п'ес, заслужаны артыст рэспублікі Літвінаў.

Для дэлегатаў усебеларускага з'езда советаў тэатр паставіць «Камец дружбы», «Жыццё кліча» і інш.

КУРСЫ ДЛЯ ПІСЬМЕННІКАЎ-КОМСАМОЛЬЦАЎ

Гэтымі днямі ў Маскве адкрываюцца трохмесячныя курсы павышэння кваліфікацыі пісьменнікаў-комсамольцаў. Курсы арганізаваны ЦК ВЛКСМ і праўленнем саюза совецкіх пісьменнікаў.

З Беларусі на курсы пасылаюцца т.т. Мікуліч, Куляшоў, Мальцінскі, Агняцвет і Шарапаў.

Шахматны турнір-чэмпіянат СССР

ЛЕНІНГРАД. VIII тур 16 снежня.

Выйгралі: Румін у Савіцкага, Макагонаў у Верасава, Белавенец у Ільіна-Жэнеўскага, Мазель у Палова, Кан у Дубініна і Алатарцаў у Рабіновіча. У нічыю закончылі партыю: Чэгавер — Юдовіч. Не закончылі партыі: Фрэйман — Рагозін, Раузер — Багатырчук і Левенфіш — Лісіцын.

Становішча пасля VIII туру:

На першым месцы чэмпіён Ленінграда Алатарцаў + 6. Далей Белавенец +5,5; Кан і Багатырчук па +6 37; Макагонаў, Юдовіч і Чэгавер па +4,5; Левенфіш +4 з 6-ці; Рагозін +4 з 7-мі; Рабіновіч +3,5 з сямі; Мазель +5 з васьмі.

З разыграных партый асабліва трэба адзначыць выйгрыш Алатарцава ў апошнім туры супроць Рабіновіча. Гэта партыя лепшая ў турніры. Яшчэ трудна сказаць, хто будзе пераможцай турніра бо дойдзе пераможцай турніра бо дойдзе выйгрыш адкладзеных партый можа змяніць становішча. Добра і ўпэўнена грае малады майстар Белавенец (Масква), — адзін з удзельнікаў, які яшчэ да гэтага не прайграў ніводнай партыі. Таксама напружана і дакладна грацць Левенфіш і Багатырчук, якія тэарэтычна могуць дагнаць лідэра, бо ў Багатырчука адкладзена партыя ў лепшым для яго становішчы, а ў Левенфіша дзве адкладзеныя партыі таксама ў лепшым для яго палажэнні. Нядрэнна стаіць майстар Мазель. Нечакана не паказвае ігры лепшы знаўца тэорыі майстар Раузер, якога можна было лічыць адным з кандыдатаў на пярэдняцтва. Асталося іграць яшчэ 11 тураў. Ігра ў турніры выключна напружаная. Пры такой ігры могуць быць нечаканыя вынікі.

Менскі гарадскі камітэт КП(б)Б склікае сёння ў 7 гадзін вечара ў Доме партактыва **сход партыйнага, прафесіянальнага і комсамольскага актыва**, прысвечаны XV гадавіне вызвалення брацкай Украінскай ССР ад белагвардзейскіх банд Дзенікіна.

Парадак дня:

Выступленні т.т. **Коніка** (загатчык аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б); **Поса** (інстытут гісторыі партыі); Вайнера, Гарачова, Хейфеца (рад. газ. «Рабочий») і інш. удзельнікаў барацьбы за вызваленне УССР ад белагвардзейскіх банд Дзенікіна.

Уваход па запрашальных білетах.

Сакратар Менгаркома КП(б)Б РЫСКІН.

СПІС

ТАВАРЫШОЎ, ВЫЛУЧАНЫХ МЕНГАРКОМАМ КП(б)Б ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ПАЛІТДНЯ 22-XII г. г. АБ ПРАКТЫЧНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РАШЭННЯЎ ПЛЕНУМАЎ ЦК ВКП(б) І ЦК КП(б)Б АБ АДМЕНЕ КАРТАЧНАЙ СІСТЭМЫ

Каменеў, Жуковіч, Хрыпач — завод імя Варашылава; Іванкоў (КСК), Шулькін, Патапейка — завод імя Кірава; Лейзер, Конік, Верба — завод «Большэвік»; Галецкі, Давідовіч — завод «Ударнік»; Агульнік — завод жанчынаў; Галіна; Хадасевіч, Гершон, Касцюковіч — фабрыка імя Кагановіча; Хейфец («Рабочий»), Таваксльн — друкарня імя Сталіна; Этле, Лур'е — электрастанцыя; Гуревіч (Жукуганяло), Кудзелька, Фрыдман—завод імя Молатава; Зуськоў — ВЭО; Владзіміроўскі — МТМ; Джэлюк, Абрамаў — ПЭП; Шпітальнік — шпалерная фабрыка; Чыжова, Фішлык — шчаціннная фабрыка; Евельбейн — шчотачная фабрыка; Сакалян, Шчарбакоў — фабрыка «Усходу»; Задзярнюк — фабрыка імя Тэльмана; Міккін — фабрыка індывідуальных заказаў; Чарнякоў, Горын, Бер — фабрыка «Окцябр»; Баскінд, Фрышман — фабрыка саказіка», Аўтустайціс — фабрыка «КІМ»; Ашаровіч (БелАН), Якуб — фабрыка імя Крупскай; Нізаўцоў — фабрыка імя Фрунзе; Бэрман — скарняжная фабрыка; Зярнецкі — лямцавая фабрыка; Гвалдзецкі, Хейфец (Заготзярно) — хлебазавод; Суханава — «Чырвоны тэстыльшчык»; Каулін (Белпромбуд); Гінзбург (прадкуратура) — Менбуд; Кейлін — майстэрні Белпромбуда; Клімаў — завод стандартных дамоў; Крайзін — трамвайрк; Каган (Менгарчгандаль) — пажарная ахова; Герасімаў (ЦСПСБ), Кузнецова, Слонім — фабрыка «Комунарка»; Дубец — мясакамбінат; Клімовіч — завод «Беларусь»; Жарскі — малочны завод; Петровіч (СНК) — завод малочных кіслот; Грышкевіч — завод «Чырвоная зорка»; Данілаў (Асо) — спіртазавод; Валабрынскі — дрожжавод «Пролетарый»; Поліцуў — шклозавод; Каштароў (Асо) — «Чырвоны хімік», Чорны — Белкамунбуд; Фраёлін — пагальны завод № 1-3; Хейфец (ВПІ) — пагальны завод № 2-4; Захарава — пагальны завод № 5-6; Драгілеў (КІЖ) — пагальны камбінат № 1; Пінчук — пагальны завод № 6; Мельцер (ВПІ) — аўтэрэзервуарная станцыя; Шульц—клінкерны завод, Олікер — хімфармзавод.

РЭЗЕРВ:

Розенгаўз, Шнейдэр, Розін, Асуроўскі, Немец, Цыпіна, Клеванаў, Агок, Богарад, Алес, Любін, Кісялёў, Елнеўскі, Старавойтаў, Выдра, Кучынскі, Опэрова, Алсейцаў, Домбаль, Краўчук, Гінзбіна, Меншыкаў, Флюр, Пароченін, Гімельфарб, Кірштэйн, Ляўкова, Окур, Прусіна.

21 снежня ў 7 гадзін веч. ў Доме партактыва інструкцыйны даклад для дакладчыкаў сакратароў парткомаў і парторгаў па пытаннях паступіўшых ад рабочых да палітдня.

Уваход па спецыяльных білетах, якія можна атрымаць у ГК, пакой № 51.

Нам. сакратара менгаркома КП(б)Б ХАДАСЕВІЧ.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

19 снежня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Дома партактыва адбудуцца чарговыя заняткі пропсемінараў па гісторыі партыі, каньшкол, першапачатковых школ па ленінізму, марксісцка-ленінскіх гурткоў і кіраўнікоў школ з беспартыйнымі рабочымі, палітшкол КСМ.

Дом партактыва пры ГК КП(б)Б.

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

ЦІ ПАДПІСАЎСЯ ТЫ НА ГАЗЕТЫ І ЖУРНАЛЫ на 1935 год?

ПАМЯТАЙ — АПОШНІ ТЭРМІН здачы падпіскі на маскоўскія выданні — 20 СНЕЖНЯ, МЯСЦОВЫЯ — 25 СНЕЖНЯ.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА штодзённа з 9 гадзін раніцы да 9 гадзін вечара ў памяшканні гарбюро Саюзкруку (Карла Маркса, 10) і НА ПОШЦЕ (Ленінская, 34).

МЕНГАРБЮРО САЮЗДРУКУ.

Дэзінфекцыйнае бюро пры ЦК Чырвонага Крыжа БССР

даводзіць да ведама ўсіх установаў і домаўласнікаў, што з 20-XII—34 г. прыступлена да заключэння ўмоў на 1935 г. на правядзенне

дэзінфекцыі двароў, выграбных ям, прыбіраленьні і т. д.

Умовы заключаюцца ў памяшканні ЦК Чырвонага Крыжа БССР, па вул. К. Маркса, 3, пакой № 2.

У ніжэйнаступным парадку: 4 адда. міліцыі—з 20-XII. па 1.1—35 г., 3-е адда. міліцыі з 1-1 па 10-1—35 г., 2-е а. да. міліцыі з 10-1 па 20-1—35 г., 1-е адда. міліцыі з 20-1 па 1-11—35 г.

Дэзінфекцыйнае бюро.

20 снежня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра (вул. Валадарскага, 7) адбудзецца

ПЕРШЫ АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПЛЕНУМ

нававыбранага Менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў XIV склікання

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Вынікі выбараў і далейшыя задачы работы Менгорсовета.
2. Выбары: а) прэзідыума горсовета.
б) старшыні і сакратара горсовета,
в) мандатнай камісіі.
3. Выбары на Усебеларускі з'езд советаў.

На пленум па сваіх мандатах уваходзяць: члены і кандыдаты горсовета, члены ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ, члены ЦВК і СНК БССР, упаўнаважаныя КПК і КСК, члены бюро гаркома КП(б)Б і гаркома ЛКСМБ, члены прэзідыума ЦСПСБ.

Запрашаюцца дэпутаты мінулага складу горсовета і ўдарнікі прадпрыемстваў і ўстаноў.

Білеты атрымаць у Горсовеце, 38 пакой 3 паверх) 19 і 20 снежня.

Прэзідыум Менгорсовета.

Згодна пастановы ЦВК і СНК БССР ад 5 сакавіка 1931 г.,

усе ўласнікі свіней абавязаны знімаць скуры

усіх убіваемых і падпрышных ад незаразных хваробаў свіней, не глядзячы на ўзрост.

Для лепшага абслугоўвання масельніцтва па з'ёмцы свіных скур

райзаготкантора Саюзгаготскур высылае па першаму выкліку высокакваліфікаваных з'ёмшчыкаў.

Для выкліку з'ёмшчыкаў звяртацца ў Саюзгаготскур (Революцыйная 16-19) або па тэлеф. 22-182, 20-832.

паведамляем, што знімаецца ў асноўе і апрацоўка свіных туш прыцягваюцца да адказнасці па 152 і 196 арт. КК.

САЮЗГАГОТСКУР.

19 снежня, у 9 гадзін раніцы, у памяшканні Дзяржаўнай бібліятэкі (пакой № 26) Менгарана сумесна з культаддзелам ЦСПСБ і метадсектарам Дзяржаўнай бібліятэкі СКЛІКАЕ

НАРАДУ усіх масавых палітасветных, профсаюзных, школьных, навуковых і іншых бібліятэк гор. Менска.

ПА ПЫТАННЮ падрыхтоўкі да ленінскіх дзён і замацавання работы па рэалізацыі ў рабоце бібліятэк пастаноў лістападаўскага пленума, і літаратурнага паходу.

Яўка абавязкова.

АНОНС!

ВЯСЁЛЫЯ РЭБЯТЫ

Кіно—джаз—камедыя.

Памяшк. БДТ—1 Белдзяржтэатр Оперы і Балета

Тэл. 24905

Мастацкі кіраўнік І. А. ГІТГАРЦ

Сёння 18 снежня

для ударнікаў і знатакоў ЗОТ

ПІКАВАЯ ДАМА

Пачатак у 8 гадз. вечара.

Застаўшыяся білеты ў касе тэатра з 12—2 і з 5—8 гадз. веч.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" — Вялікая совецкая камедыя ФЛАГ СТАДЫЁНА

Гукавы кіно-тэатр „Пролетарый" — Гукавы мастацкі фільм Чатыры візіты САМУЭЛЯ ВУЛЬФА

Кіно „Інтэрнацыянал" — Новая вясёлая камедыя ПРЫЖОК

Кіно „СПАРТАК" — ЗА ШТО ЯЕ СУДЗІЛІ (ТАМ І ЛА) драма ў 6 частках

Кожны сельсавет, калгас, школа, хата чытальня, гурток баявой падрыхтоўкі, кожны пераменніх павінны падпісацца на акруговыя газеты

„Красноармейская праўда" і „Чырвонаармейская праўда" на 1935 г.

Падпісная цана 1 р. 25 к. у месяц.

Падпіску здаваць у бліжэйшыя паштовыя аддзяленні і пісьманосцам.

Пры здачы падпіскі патрабуйце падпісны квіток.

20 снежня ў Доме мастака, у 7 г. вечара, АДКРЫВАЕЦЦА гарадская ВЫСТАЎКА МАЛЮНКАЎ вучняў школ г. Менска.

УВАХОД ВОЛЬНЫ.

Менгарана. ГК ЛКСМБ.

МЕНСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ БЕЛДЗЯРЖТРАНСА

з 15 снежня г. г. ПРЫСТУПІЛА ДА ЗАКЛЮЧЭННЯ ДАГАВАРОЎ НА АЎТАГУЖАВЫЯ ПЕРАВОЗКІ І ТРАНСПАРТНА-ЭКСПЕДЫЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ.

ПРОСЬБА да ўсіх зацікаўленых прадпрыемстваў і устаноў ЗАКЛЮЧЫЦЬ ДАГАВОРЫ ДА 1 СТУДЗЕНЯ 1935 Г., пасля якога заключэнне дагавораў будзе спынена.

Адрас: Маскоўская, 3, 1 п. верх, пакой 8

Друкарні газ. „ЗВЯЗДА" ПАТРЭБНЫ ПАДЧЫТЧЫКІ

Зварачацца да дырэктара друкарні Совецкая, 61, другі паверх.

ЦСПСБ і фінсекцыя горсовета прапануюць

усім вылучаным таварышам для праверкі правільнасці налічэння падаходнага падатку і культбору закончыць праверку і прадстаўленне актаў у гарфа

не пазней 20 га снежня.

Фабзаўкамам праверыць выкананне ў вызначаны тэрмін.

ЦСПСБ Фінсекцыя.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы — КРУЧКОЎ, ст. рэдактар — БЯРОЗАВІК ст. метрамп. аж — ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стадарт. ыпір — ПЕДЗІК, ст. друкар АНУЧЫН. Тыраж 57.000 Уп. Галоўлітбіта № 6322.